Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 81 (30215)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

САМЫ МАЛАДЫ НАРОДНЫ ВЫБРАННІК

НАС ЧАКАЮЦЬ НОВЫЯ ПРЫШЧЭПКІ 13

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Беларусы сталі жыць лепей. У параўнанні з 1995-м рэальныя грашовыя даходы насельніцтва выраслі больш як у 9 разоў, рэальная зарплата — у 12,4 раза, у тым ліку за тры гады бягучай пяцігодкі — на 14,6 %. У краіне забяспечаны стапрацэнтны доступ грамадзян да медыцынскіх паслуг. Па паказчыках у сферы адукацыі Беларусь уваходзіць у групу 30 найбольш развітых дзяржаў планеты. Па ўзроўні забяспечанасці насельніцтва жыллём наша краіна — адна з лідараў у СНД: па выніках 2022 года паказчык на аднаго чалавека склаў 29,4 кв. м, што ў 1,5 раза вышэй, чым 30 гадоў таму».*

# Вяршыня народаўладдзя

Фота Вікцара ІВАНЧЫКАВА.

**Сёння распачынае сваю работу Усебеларускі народны сход. Гэта мерапрыемства ўжо сёмае па ліку ў сучаснай гісторыі нашай незалежнай краіны, але сёлета яно асабліва знакавае. Упершыню, згодна са зменамі і дапаўненнямі ў Канстытуцыю, прынятымі два гады назад на рэспубліканскім рэферэндуме, УНС набыў статус найвышэйшага прадстаўнічага органа дзяржаўнай улады. Амаль тысяча дзвесце чалавек, якія прадстаўляюць усе рэгіёны і сацыяльныя групы Беларусі, высокую ўладу і мясцовае самакіраванне, грамадзянскую супольнасць, збяруцца, каб вырашаць найважнейшыя пытанні развіцця краіны. Фактычна ў іх руках будучыня дзяржавы і народа, бо рашэнні, якія яны прымуць, не падлягаюць адмене або аспрэчванню нейкай іншай інстанцыяй.**

**На такое шырокае прадстаўніцтва, на наданне такіх паўнамоцтваў можа рашыцца толькі моцная дзяржава. Беларусь і сённяшнім днём у тым ліку даказвае ўсяму свету, што яна менавіта такая і ідзе па ўласным шляху развіцця і сапраўднага народаўладдзя.**

## КАРАТКА

- **Агароднінныя культуры ў Беларусі высадзілі на 26,6 працэнта запланаваных плошчаў.**
- Выручка арганізацый ДА «Белводгас» ад платнай рыбалкі за мінулы год наблізілася да Br1 млн.
- **Тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту Гомельскай вобласці ў студзені — сакавіку гэтага года склаў 101,6 працэнта да аналагічнага мінулагодняга перыяду.**
- Беларуская ўніверсальная таварная біржа прыме ўдзел у стварэнні міжнароднай біржавой сістэмы індыкатараў тавараных рынкаў.

Падзея

## Новыя сусветныя тэхналогіі і практыкаарыентаванасць

### Адкрыўся міжнародны форум «Ахова здароўя Беларусі»

Фота Вікцара ІВАНЧЫКАВА.

**У сталіцы адкрыўся XXIX Міжнародны медыцынскі форум «Ахова здароўя Беларусі — 2024», які ўключае спецыялізаваную выстаўку і шырокую дзелавую праграму. Сёлета ён прыўрочаны да 105-годдзя сістэмы аховы здароўя Беларусі. У рамках мерапрыемства адбудзецца каля 30 навукова-практычных канферэнцый і тэматычных семінараў з удзелам спецыялістаў вядучых РНПЦ краіны, у тым ліку пяць мерапрыемстваў па анкалагічнай тэматыцы. Сёлета ў выстаўцы бяруць удзел больш за 160 экспанентаў з васьмі краін. Сярод іх — вядучыя айчынныя і замежныя вытворцы медыцынскай тэхнікі, вырабаў медыцынскага прызначэння, расходных матэрыялаў, стаматалагічнага абсталявання і фармацэўтычнай прадукцыі.**

СТАР. 3

Дзяржаўны інтарэс

## ДЛЯ АГУЛЬНАЙ БУДУЧЫНІ

### Наколькі эфектыўна працуе сістэма інтэлектуальнай уласнасці?

**Штогод 26 красавіка ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень інтэлектуальнай уласнасці. Яго тэма ў 2024 годзе — «Інавацыі і творчасць на карысць агульнай будучыні». Як працуе сістэма аховы інтэлектуальнай уласнасці ў нашай краіне? Беларусь — удзельнік 19 з 26 міжнародных пагадненняў у галіне абароны інтэлектуальнай уласнасці, якія працуюць пад эгідай Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, расказаў першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Дзяніс КАРЖЫЦКІ.**

— Ва ўсім свеце інтэлектуальная ўласнасць актыўна ўкараняецца ў эканамічны абарот, — падкрэсліў ён. — Адзін з моцных бакоў Беларусі — актыўнасць у галіне падачы заявак на вынаходніцтвы і карысныя мадэлі. Наша краіна з'яўляецца ўдзельнікам працэсаў патэнтавання ў рамках Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Гэта дазваляе не адставаць ад сусветных працэсаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

На кантролі

# «МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ СТАЛІЦА ВЫГЛЯДАЛА СУЧАСНА, ЭСТЭТЫЧНА І ДОБРАЎПАРАДКАВАНА»

## Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях рэкламы

**Да гэтай тэмы Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску, звяртаецца рэгулярна. Ні адна нарада з прадстаўнікамі Мінгарвыканкама не абыходзіцца без акцэнтавання ўвагі на эстэтычным абліччы сталіцы, у тым ліку ў пытаннях вонкавай рэкламы. Пры гэтым спікер скіроўвае адказных асоб не толькі да прыгажосці і гарманізацыі рэкламнай прадукцыі, але і яе якаснага тэматычнага напаўнення.**

Размова падчас нарады ішла не толькі аб сталіцы, але і аб Мінскай вобласці — у частцы, якая датычыцца Мінскай кальцавой дарогі. «Гэта задача не новая — па эстэтызацыі гарадскога асяроддзя, вонкавай рэкламе, асвятленні, падсветцы, добраўпарадкаванні, — удакладніла Наталля Качанава. — Перад намі стаяць вельмі сур'ёзныя задачы, бо мы разумеем, што горад Мінск — гэта сталіца, аблічча нашай краіны, і таму мы павінны зрабіць усё, каб сталіца выглядала сучасна, эстэтычна і добраўпарадкавана для свайго насельніцтва».

Наталля Качанава нагадала, што задачы пастаўлены кіраўніком дзяржавы і іх трэба выконваць. «Да 1 мая мы павінны поўнасцю навесці парадак з вонкавай рэкламай у Мінску, — канкрэтызавала спікер. — Не проста з устаноўкай білбордаў і яшчэ нейкіх канструкцый, а менавіта са зместам рэкламы. У сталіцы праходзяць сур'ёзныя мерапрыемствы. Рыхтуемся да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пачынае сваю работу Усебеларускі народны сход, шэраг іншых мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца і праводзяцца ў нашай краіне. Таму, вядома, і змест рэкламы павінен адлюстроўваць наша жыццё — тое, што адбываецца ў нашай краіне».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што гэтае пытанне знаходзіцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі. «Мае калегі практычна кожны тыдзень праязджаюць горад у розных яго частках, — паведаміла спікер. — Пачнём з таго, што мы пакажам, якая рэклама ў нас на сёння ёсць і дзе ёсць яшчэ нейкія праблемы. Але 1 мая — для ўсіх нас час, калі мы павінны гэтую работу завяршыць».

Дарэчы, парламентарыі ажыццявілі вялікую работу ва ўдасканаленні заканадаўства па пытаннях рэкламы. Найважнейшыя праблемныя моманты, якія даўно патрабавалі заканадаўчага ўрэгулявання, разглядаліся на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. Праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях рэкламы» быў адобраны членамі Савета Рэспублікі на пасяджэнні 11-й сесіі Савета Рэспублікі 29 снежня 2023 года. Яго асноўныя палажэнні ўступяць у сілу 11 ліпеня 2024 года.

У прыватнасці, павялічыцца час для размяшчэння рэкламы ў радыё- і тэлепраграмах, якія трансліруюцца з 18.00 да 22.00, знімецца забарона на размяшчэнне рэкламы ў выглядзе накладання, у тым ліку спосабам «бягучага радка», у перадачах працягласцю менш за 15 хвілін. Мяняюцца падыходы да ўзгаднення вонкавай рэкламы і рэкламы на транспарце: цяпер яна будзе ўзгадняцца з мясцовымі органамі ўлады. Удакладняюцца патрабаванні па размяшчэнні рэкламы на помніках архітэктуры і іншых аб'ектах нерухомай матэрыяльнай спадчыны. Уводзіцца забарона на аказанне паслуг па размяшчэнні рэкламы ў інтэрнэце юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія не ўключаны ў Рэестр рэкламараспаўсюджвальнікаў і інш.

Як паведаміла ў размове з журналістамі **дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Мінскрэклама» Таццяна КАЛІЦІНА,** на сёння ў Мінску дзейнічае больш як 20 буйных сеткавых аператараў, вялікая колькасць шчытавых рэкламных канструкцый і канструкцый, прызначаных для размяшчэння вонкавай рэкламы. «Гэтае пытанне — штодзень на кантролі ў горадзе, маніторынг праводзіцца сістэматычна, — удакладніла яна. — Безумоўна, выяўляюцца парушэнні, якія датычацца як тэхнічнага стану шчытавых рэкламных канструкцый, так і якасці і актуальнасці сюжэтаў вонкавай рэкламы. Гэтаму ўдзяляецца ўвага. Пры выяўленні парушэння выносіцца прадпісанне, адпаведна, кантралюецца да ліквідацыі парушэння».

Таццяна Каліціна заўважыла, што змяненні ў заканадаўства аб рэкламе прымаліся выключна на падставе практычнай дзейнасці. Па яе словах, новаўвядзенні як дадуць магчымасць упарадкаваць усю вонкавую рэкламу ў горадзе Мінску, так і прывесці яе ў годны стан, які прэзентуе сталіцу.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Уладзіміра Мікалаевіча ПАЛУЯНА, былога міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Святлане Уладзіміраўне Барташ у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Заканадаўчыя навацыі

# СПРОШЧАНАЯ ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ І НОВЫЯ ВІДЫ ФІНАНСАВАЙ ПАДТРЫМКІ

## Тлумачым падрабязнасці падпісанага Прэзідэнтам Закона «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці»

**Як ужо паведамляла «Звязда», падпісаны днямі кіраўніком дзяржавы дакумент устанаўлівае абноўленую архітэктуру прадпрымальніцтва і прадугледжвае дзве катэгорыі, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю: юрыдычныя і фізічныя асобы. Да юрыдычных асоб аднесены малыя арганізацыі з колькасцю работнікаў да 100 чалавек, сярэднія — да 250 супрацоўнікаў і буйныя — звыш 250 чалавек. У катэгорыю фізічных асоб уключаны рамеснікі, уладальнікі аграэкасядзіб, самазанятыя, індывідуальныя прадпрымальнікі.**
**Як будуць на справе рэалізоўвацца нормы закона, расказалі эксперты.**

### З індывідуальнага прадпрымальніка ў юрыдычную асобу — за адзін дзень

Як звярнуў увагу **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР,** з зацвярджэннем закона будзе ўкаранёны і ўступіць у сілу шэраг чаканых з боку прадпрымальніцтва, у тым ліку і рэгулятараў, новаўвядзенняў, якія створаць дадатковыя ўмовы для маштабавання бізнесу. «У гэтым кірунку мы адпрацоўвалі, каб бізнес мог павялічваць сваю вытворчасць, гандаль і паслугі дзякуючы прынятаму закону, — дадаў ён. — У першую чаргу мы глядзелі на тое, каб стварыць умовы для стымулявання пераходу ў юрыдычную асобу».

Па словах міністра, законам прадугледжана магчымасць перарэгістрацыі ў юрыдычную асобу за адзін дзень. «Гэта не проста тэхнічная перарэгістрацыя, — удакладніў ён. — За будучай юрыдычнай асобай застануцца ўсе дзейныя на той момант дазвольныя дакументы: сертыфікаты, ліцэнзіі і іншае. У тым ліку ёсць магчымасць у паскораным рэжыме перарэгістраваць свой разліковы рахунак у банку. Другая стымуляцыйная мера — захаванне для юрыдычных асоб магчымасці спрошчанага адміністравання па розных кірунках. Напрыклад, справаводства можна будзе весці як і раней».

Кажучы аб дадатковых мерах падтрымкі, прадугледжаных законам, Юрый Чабатар заўважыў, што будзе арганізавана выдача грантаў з боку мясцовых органаў кіравання або паручальніцтва па пазыках. Ён лічыць, што такія новаўвядзенні істотна падштурхнуць бізнес да таго, каб пераходзіць у форму юрыдычнай асобы.

### «Захоўваюцца льготы — захоўваюцца і абавязкі»

На стадыі распрацоўкі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці» прайшоў шырокае грамадскае абмеркаванне з прыцягненнем практычна ўсіх катэгорый бізнес-супольнасці: ад індывідуальных прадпрымальнікаў да прадстаўнікоў малога, сярэдняга і буйнога бізнесу. Як паказалі вынікі гэтага абмеркавання, рэформа бізнес-супольнасцю ўспрымаецца канструктыўна.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Віктар НІКАЛАЙКІН** лічыць Закон «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці» своечасовым і вельмі важным дакументам. «З моманту прыняцця дзеючых цяпер законаў, якія рэгулююць прадпрымальніцкую дзейнасць, прайшоў пэўны час, — заўважыў ён. — За гэты перыяд, з аднаго боку, выявілася шэраг пытанняў, якія з пункту гледжання правапрымяняльнай практыкі патрабавалі змяненняў. З іншага боку, прадпрымальнікі, у тым ліку індывідуальныя, імкнуцца да таго, каб іх бізнес быў паспяховы і развіваўся, аднак на пэўнай стадыі дзейнасці сёння законы пачынаюць тармазіць далейшае развіццё, маштабаванне гэтага прадпрымальніка».

Па словах дэпутата, новым законам прадугледжана зняцце шэрагу абмежаванняў, якія да нядаўняга часу не дазвалялі прадпрымальнікам развівацца далей. У прыватнасці, індывідуальны прадпрымальнік, гадавая выручка якога складае звыш 500 тысяч рублёў, не мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Акрамя таго, абмежаванні датычацца і колькасці работнікаў, якіх прадпрымальнік можа выкарыстоўваць у наём. «Згодна з дзейным заканадаўствам, яму трэба пераходзіць у іншую арганізацыйна-прававую форму — гэта значыць стварацьюрыдычную асобу, — патлумачыў Віктар Нікалайкін. — Для таго каб гэта зрабіць, спачатку трэба закрыць індывідуальнае прадпрымальніцтва. Гэта прадугледжвае вялікую колькасць працэдур, таму самі бізнесмены кажуць, што не трэба ісці гэтым шляхам, бо некалькі месяцаў, а то і год-два будзеш хадзіць па інстанцыях, каб закрыць сваё ІП. А потым яшчэ трэба будзе стварацьюрыдычную асобу».

Новы Закон «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці», па словах парламентарыя, не толькі стварае ўмовы для развіцця бізнесу, але і забяспечвае магчымасць справядлівай канкурэнцыі для ўсіх прававых форм бізнесу. «Закон прадугледжвае надзяленне паўнамоцтвамі ўрада зацвярджаць пералік відаў паслуг і работ, якія будзе мець права выконваць індывідуальны прадпрымальнік, — канкрэтызуе Віктар Нікалайкін. — Калі ты знаходзішся ў гэтым спісе, можаш і далей спакойна працаваць у якасці ІП. Калі даход перавышае ўстаноўленыя 500 тысяч рублёў за год, то ты можаш напісаць заяву і на працягу сутак па спрошчанай, зразумелай працэдуры перайсці з індывідуальнага прадпрымальніка ў юрыдычную асобу. Пры гэтым за табой захоўваюцца ўсе льготы, банкаўскія рахункі, сертыфікаты, дазволы, якія ты меў як ІП. Аднак у той жа час за табой захоўваюцца адказнасць і абавязацельствы перад дзяржавай, якія ты ўжо ўзяў на сябе як ІП, або перад пэўнымі суб'ектамі гаспадарання. Гэта справядліва: захоўваюцца льготы — захоўваюцца і абавязкі».

Як падкрэсліў старшыня Пастаяннай камісіі, той, хто хоча далей развівацца, безбалюча ажыццявіць пераход за суткі і будзе далей працаваць, але ўжо на правах юрыдычнай асобы. «Да канца 2025 года трэба будзе вызначыцца: або пераходзіць у юрыдычную асобу па спрошчаным механізме, або заставацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, але выконваць іншыя віды работ, якія будуць у пераліку ўрада, — канкрэтызаваў ён. — Такім чынам, новаўвядзенні прадыктаваны правапрымяняльнай практыкай, створаць роўныя ўмовы для ўсіх форм бізнесу і даюць магчымасць бізнесу ўмацоўвацца, развівацца і рухацца наперад».

Па словах **члена Савета Рэспублікі Валянціна БАЙКО,** заканадаўства аб прадпрымальніцкай дзейнасці з'яўляецца самай мабільнай часткай грамадзянскага заканадаўства любой дзяржавы. «Гэта і зразумела: прадпрымальніцтва — ініцыятыва, пастаянныя змены, навацыі і пошук новых магчымасцяў, — патлумачыў ён. — Заканадаўства аб прадпрымальніцкай дзейнасці ў Беларусі прайшло некалькі паслядоўных этапаў станаўлення і працягвае ўдасканальвацца. Лагічным завяршэннем чарговага цыкла трансфармацыі як самога інстытута «прадпрымальніцтва», так і нарматыўнага рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці стала прыняцце Закона «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці».

Сенатар нагадаў, што адной з найважнейшых умоў паспяховага развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы з'яўляецца забеспячэнне роўных умоў і татальнае выкананне ўстаноўленых правілаў. «У сувязі з гэтым уяўляецца, што карэкціроўка правілаў ажыццяўлення індывідуальнага прадпрымальніцтва будзе садзейнічаць вырашэнню менавіта гэтых задач, — адзначыў Валянцін Байко. — Законам, з аднаго боку, уводзіцца пэўны ліміт на віды дзейнасці, якімі можна будзе займацца без утварэння юрыдычнай асобы (і па гэтай прычыне мець некаторыя перавагі перад юрыдычнымі асобамі); з іншага боку, пашыраюцца магчымасці для малых форм прадпрымальніцтва па атрыманні дзяржаўнай падтрымкі на вядзенне бізнесу. Калі ўсё атрымаецца, як задумана распрацоўшчыкамі ўжо прынятага закона (а няма бачных прычын да таго, каб нешта не было рэалізавана), то ў выніку грамадства атрымае больш транспарэнтнае бізнес-асяроддзе, рост даходаў бюджэту і максімальна цывілізаваныя формы адносін па лініі «бізнес — грамадства — дзяржава».

**Вераніка КАНЮТА.**

# Новыя сусветныя тэхналогіі і практыкаарыентаванасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця форуму прыняў удзел **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Ён нагадаў, што 2024-ы ў Беларусі аб'яўлены Годам якасці. Медыцына не выключэнне.

— Менавіта ад якаснай медыцынскай дапамогі залежыць стан здароўя кожнага чалавека. Мы забяспечваем аказанне неабходнай меддапамогі, пачынаючы ад самай маленькай вёсачкі і да хутара і заканчваючы абласнымі цэнтрамі і сталіцай нашай краіны. Выбудаваная сістэма меддапамогі дае магчымасць аказаць людзям увесь спектр медпаслуг, — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі вельмі вялікая ўвага ўдзяляецца падтрыманню здаровага ладу жыцця.

— Там, дзе патрэбна кваліфікаваная і якасная медыцынская дапамога, мы развіваем гэтыя кампетэнцыі, тэхналогіі. Сёння вы зможаце наглядна пераканацца, як развіваецца сістэма аховы здароўя нашай краіны, як укараняюцца перадавыя міжнародныя тэхналогіі і практыкі, неабходныя для аказання якаснай і кваліфікаванай медыцынскай дапамогі.

Пры гэтым падтрыманне здароўя ў многім залежыць ад кожнага чалавека, а медыкі пракансультуюць пацыента, які мае патрэбу ў адпаведнай меддапамозе. Адметна, што ўзровень беларускіх урачоў даўно ацанілі нашы суседзі і грамадзяне з больш далёкіх краін.

— Мы ганарымся тым, што толькі па выніках мінулага года экспарт медыцынскіх паслуг у 140 краін свету склаў больш як 40 мільёнаў. Актыўна працуе наша сістэма адукацыі. Студэнты з больш як 50 краін атрымліваюць якасную медыцынскую адукацыю. Толькі за мінулы год лічба экспарту адукацыйных паслуг склала больш як 30 мільёнаў, — прывёў лічбы Ігар Петрышэнка.

Ён адзначыў, што на выставачнай пляцоўцы прадстаўлены ўсе найлепшыя распрацоўкі РНПЦ, перадавых клінік — увесь спектр, які датычыцца падтрымання здароўя чалавека. У час дзелавой праграмы будуць актыўна абмяркоўвацца і выпрацоўвацца новыя падыходы, новыя методыкі для аказання медыцынскай дапамогі. Сярод іх — укараненне штучнага інтэлекту.

— Аднак, як бы не развівалі штучны інтэлект, перадавыя тэхналогіі, усё залежыць ад кваліфікацыі ўрача і яго ведаў, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Аб новых тэхналогіях, у прыватнасці перспектывах лічбавай трансфармацыі сферы аховы здароўя, гаварыў і **міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ.** Лічбавізацыя дасць магчымасць адысці ад залішняга дакументабароту, медработнікі змогуць больш аператыўна атрымліваць неабходную інфармацыю аб пацыенце.

— Мы працуем над тым, каб аб'яднаць усе існуючыя распрацоўкі ў адзіную платформу. Гэта павінна адбывацца на працягу 2024—2025 гадоў, — адзначыў міністр.

І ўжо ў пачатку 2025 года аб'яднанне існуючых праграмных рашэнняў дасць свой вынік, а першы этап гэтай работы павінен завяршыцца да канца 2024 года.

Гаворачы аб напаўненні будучай адзінай сістэмы электроннай аховы здароўя, Аляксандр Хаджаеў назваў сэрвісы, якія датычацца электроннага рэцэпта, электроннай аптэкі, электроннага дакументабароту і інш.

Што датычыцца спецыялізаванай выстаўкі, якая праходзіць у рамках міжнароднага медыцынскага форуму, то яна дэманструе працэс імпартазамяшчэння ў гэтай сферы.

— Усе нашы ноу-хау датычацца ў першую чаргу практыкі кожнага дня. Мяне вельмі ўзрадавала тое, што адбылося імпартазамяшчэнне. Нашы рэанімацыйныя ложкі валодаюць усім функцыяналам, які неабходны для штодзённага маніторынгу і аблягчэння працы, у тым ліку і функцыяй узважвання. Тыя задачы, якія ставяцца нашымі ўрачамі-практыкамі, павінны Міністэрствам аховы здароўя аналізавацца, аб'ядноўвацца і ператварацца ў вынік, — адзначыў Аляксандр Хаджаеў.

Ложак з электрапрывадам і функцыяй узважвання, пра які казаў міністр, прадстаўлены на стэндзе дзяржаўнага прадпрыемства «Медтэхнацэнтр», вядучага беларускага вытворцы ў галіне медыцынскага абсталявання і вырабаў медпрызначэння. Выстаўлены тут і іншыя апошнія распрацоўкі прадпрыемства, накіраваныя на паляпшэнне якасці аказання меддапамогі. Гэта каляска-каталка з прыёмнай прыладай і эвакуацыйнае крэсла для аўтамабіля хуткай медыцынскай дапамогі; крэсла-скутар для інваліда; сістэма маніторынгу і дыспетчарызацыі медыцынскіх газаў з выкарыстаннем «воблачных» сэрвісаў і магчымасцю інтэграцыі дадатковых функцый маніторынгу (мікраклімат у палатах, месцазнаходжанне пацыента ў структуры лячэбнай установы і інш), якая на базе нейрасеткі ідэнтыфікуе і прагназуе паказчыкі, у некаторых выпадках папярэджваючы наступствы яшчэ да ўзнікнення інцыдэнту.

На калектыўных стэндах холдынга «Белфармпрам» і прадпрыемства «Белмедтэхніка» прадстаўлены айчынныя распрацоўкі экспартаарыентаваній медтэхнікі і лексродкаў. Міністр адзначыў, што распрацоўкі РУП «Медтэхнацэнтр», холдынга «Белфармпрам» аблягчаюць працу медработнікаў і павышаюць якасць аказання медыцынскай дапамогі.

— Наша выстаўка дэманструе тое, што новыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ва ўсім свеце, ёсць і ў нашай краіне. Адпаведна, якасць медыцынскай дапамогі адпавядае сусветным стандартам, — падкрэсліў Аляксандр Хаджаеў.

Арганізавана на выстаўцы і традыцыйная «Адукацыйная алея» з універсітэтаў медыцынскага профілю Беларусі — спецыяльная пляцоўка для прэзентацыі адукацыйных паслуг і дэманстрацыі інавацыйных распрацовак устаноў адукацыі. А РУП «Белфармацыя» прадставіла дзіцячы адукацыйны праект «Юны фармацэўт» — сімуляцыйную міні-аптэку, створаную для знаёмства дзяцей з прафесіяй фармацэўта.

У выстаўцы бяруць удзел больш за 160 экспанентаў з васьмі краін: Беларусі, Венгрыі, Індыі, Ірана, Кітая, Расіі, Егіпта, Паўднёвай Карэі. Шырокі асартымент вырабаў медыцынскага прызначэння можна ўбачыць на калектыўнай экспазіцыі індыйскіх вытворцаў. Упершыню ў выстаўцы ўдзельнічае кампанія Soficopharm, якая з'яўляецца важным гульцом на фармацэўтычным рынку Егіпта. Акрамя таго, упершыню ў Беларусі свае магчымасці прадставіць Няўрадавы фонд даследаванняў і тэхналогій медыцынскага абсталявання Ірана.

Удзельнікі выстаўкі, прадстаўнікі, дыстрыб'ютары і сэрвісныя арганізацыі падрыхтавалі шырокі спектр прадукцыі і паслуг для ўстаноў аховы здароўя і медыцынскіх цэнтраў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Вялікабрытанія пачне адпраўляць нелегальных мігрантаў у Руанду не раней за ліпень

Першыя рэйсы ў Руанду з нелегальнымі мігрантамі, якія дэпартуюцца з Вялікабрытаніі, адправяцца праз 10-12 тыдняў, не раней за ліпень, заявіў брытанскі прэм'ер-міністр Рышы Сунак. Яго цытуе Guardian. Раней меркавалася, што дэпартацыя нелегалаў у Руанду пачнецца ўжо вясной. У затрымцы прэм'ер-міністр абвінавачваў лейбарыстаў і Палату лордаў, якія чынілі розныя перашкоды на шляху прыняцця неабходнага закона. Тым не менш урад Вялікабрытаніі дабіўся яго зацвярджэння абедзвюма палатамі парламента. Каб набыць сілу закона, біль павінен быць у найбліжэйшыя дні зацверджаны каралём Карлам III. Вывозіць мігрантаў будуць камерцыйнымі чартарнымі рэйсамі, гэта будзе рабіцца рэгулярна. Схему прапанаваў вясной 2022-га тагачасны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан, каб разбурыць бізнес-мадэль па перавозцы нелегальных мігрантаў у Вялікабрытанію. Тады ж краіны падпісалі пагадненне аб міграцыйным партнёрстве, і Лондан паабяцаў інвеставаць 120 млн фунтаў у развіццё эканомікі Руанды, фінансаваць знаходжанне нелегалаў у гэтай краіне і іх інтэграцыю.

### У ЦАР трохдзённая жалоба па ахвярах караблекрушэння

У Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы (ЦАР) з пачатку тыдня аб'явілі трохдзённую жалобу ў сувязі з гібеллю амаль 60 чалавек пры караблекрушэнні на рацэ Мпока ў сталіцы краіны Бангі. Пра гэта заявіў прэзідэнт ЦАР Фостэн-Арканж Туадэра, паведаміла ТАСС. Судна, на борце якога знаходзіліся 300 пасажыраў, затанула адразу ж пасля выхаду з порта. Паводле інфармацыі СМІ, людзі накіроўваліся ў вёску для ўдзелу ў пахаванні. Сведкі здарэння расказалі, што карабель практычна разламаўся напалову на сярэдзіне ракі. Выратаваць удалося каля 100 чалавек. Урад распарадзіўся стварыць камісію для вызначэння прычын здарэння. Спецыялісты лічаць, што да караблекрушэння прывяло значнае перавышэнне колькасці пасажыраў, якіх судна магло ўзяць на борт для бяспечнага плавання.

### У Чэхію пасля 30-градуснай спякоты прыйшлі рэкордныя для красавіка маразы

Паводле звестак Чэшскага гідраметэаралагічнага ўпраўлення, на паўночным захадзе Чэхіі была зафіксавана тэмпература мінус 11,7 градуса па Цэльсію. Рэкордна нізкая тэмпература паветра была адзначана метэастанцыямі і ў іншых рэгіёнах Чэхіі. У шэрагу населеных пунктаў выпаў снег, таўшчыня покрыва якога дасягае месцамі больш за 30 см. Халоднае надвор'е захоўваецца. Аб гэтым інфармуе чэшскае інфармацыйнае агенцтва ЧТК, перадае ТАСС. Эксперты звяртаюць увагу, што небывалыя красавіцкія маразы могуць нанесці значную шкоду фруктовым дрэвам, вінаграднікам і высаджаным агароднінным культурам, што пагражае сёлетняму ўраджаю. Метэаролагі звяртаюць увагу, што маразы змянілі трапічную спякоту, якая стаяла ў Чэхіі яшчэ некалькі дзён таму. Слупок тэрмометра ў краіне падымаўся да адзнакі 31,5 градуса. Такія прыродныя анамаліі звязваюць з працэсам глабальнай змены клімату на планеце.

# ДЛЯ АГУЛЬНАЙ БУДУЧЫНІ

## Эканоміка ведаў

Эканоміка, дзе асноўнымі фактарамі развіцця становяцца веды і чалавечы капітал (эканоміка ведаў), набірае абароты ў сусветнай супольнасці. І ад таго, наколькі наша краіна будзе паспяваць за гэтымі сусветнымі працэсамі, залежыць яе канкурэнтаздольнасць, падкрэсліў прадстаўнік ДКНТ.

— Сёння ў сістэме дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях створана нацыянальная інавацыйная сістэма, у склад якой уваходзяць 16 тэхнапаркаў, шэсць цэнтраў трансферу тэхналогій, Беларускі інавацыйны фонд, Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, — паведаміў Дзяніс Каржыцкі.

Важна не толькі абараніць створаную інтэлектуальную ўласнасць, атрымаць ахоўныя дакументы, але таксама ўцягнуць яе ў эканамічны абарот, забяспечыць яе камерцыялізацыю, падкрэсліў вучоны.

— Гэта пытанне не аднаго чалавека — вынаходніка — і не аднаго ведамства. Для гэтага і створана нацыянальная інавацыйная сістэма, у рамках якой можна атрымаць як фінансавую падтрымку для развіцця сваёй распрацоўкі, так і адказы на пытанні, звязаныя з яе аховай, — адзначыў спікер. — Да 2023 года ўдалося зрушыць працэс уцягвання ў гаспадарчы абарот аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Напрыклад, назіраўся рост на 5 % заявак на вынаходніцтвы, на 23 % павялічылася колькасць заявак на таварныя знакі. Актыўна працуе біржа інтэлектуальнай уласнасці, развіваюцца працэсы ліцэнзавання: колькасць зарэгістраваных ліцэнзійных дагавораў на 80 працэнтаў перавышэла паказчыкі пяцігадовай даўнасці. Усё гэта сведчыць: мы навучыліся працаваць з інтэлектуальнай уласнасцю, ведаем, як яе ўкараніць у гаспадарчы абарот.

Цяпер работа накіравана ўжо на ўдасканаленне гэтых працэсаў і забеспячэнне ўкладу ў эканоміку.

— Хоць ужо сёння патэнтныя пошліны ад рэгістрацыі заявак склалі каля 25 млн рублёў, яны паступаюць у бюджэт краіны, — адзначыў першы намеснік старшыні ДКНТ. — Сёлета такіх плацяжоў паступіла на 36 % больш, чым у мінулым.

У Беларусі распрацавана стратэгія развіцця інтэлектуальнай уласнасці да 2030 года, расказаў Дзяніс Каржыцкі.

— Сёння найбольш распаўсюджаныя спосабы абароны інтэлектуальнай уласнасці — гэта патэнтаванне і ахова ў рэжыме ноу-хау. І да рэжыму ноу-хау ўзнікаюць пытанні — паступаюць прапановы ад дзяржорганаў і прадпрыемстваў. Працягваецца работа па ўдасканаленні заканадаўства, каб рэгламентаваць гэты працэс, забяспечваючы як абарону распрацовак, так і іх камерцыялізацыю.

## Ад ідэі да ўвасаблення

— Інтэлектуальная ўласнасць — інструмент, які дазваляе назіраць вынікі інтэлектуальнай дзейнасці ад ідэі да ўвасаблення ў жыццё і рэалізацыі ў вытворчасці, — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Уладзімір РАБАВОЛАЎ.** — Асноўныя кірункі нашай дзейнасці рэалізоўваюцца з улікам палажэнняў Стратэгіі Рэспублікі Беларусь у сферы інтэлектуальнай уласнасці да 2030 года, — дадаў ён.

Сярод актуальных кірункаў работы асабліва ўвага — лічбавізацыі дзейнасці НЦІУ. Гэта садзейнічае зручнаму і хуткаму атрыманню аховы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, падкрэсліў Уладзімір Рабаволаў:

— Сёлета запланавана 14 праектаў па лічбавізацыі, асноўныя з якіх — пераход адміністрацыйных працэдур у электронную форму, комплексная мадэрнізацыя інфармацыйнага рэсурсу «Біржа інтэлектуальнай уласнасці ў Беларусі», распрацоўка інфармацыйнай сістэмы, якая забяспечвае аўтаматызацыю атрымання інфармацыі з дзяржаўных рэестраў аб наяўнасці аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, і г. д. Прадугледжана лічбавізацыя заключэння дагавораў з ае тарамі і іншымі праваўладальнікамі.

Найважнейшы кірунак развіцця — і меры стымулявання вынаходніцтва ў нашай краіне. З 2016 года ў Беларусі рэалізоўваецца міжнародны праект Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці па стварэнні і развіцці цэнтраў падтрымкі тэхналогій і інавацый (ЦПТІ). Галоўная мэта праекта — забеспячэнне доступу да патэнтнай інфармацыі (на якую будуць арыентавацца пры стварэнні распрацовак), а таксама прававая ахова тэхналогій пры экспартных пастаўках. За кошт гэтага будзе рэалізоўвацца сувязь навукі і рэальнага сектара эканомікі, — падкрэсліў кіраўнік НЦІУ.

Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці таксама аказвае метадычную і кансультацыйную падтрымку па пытаннях аховы і кіравання інтэлектуальнай уласнасцю экспарцёрам, калі яны выходзяць на замежныя рынкі, а таксама арганізацыям, якія ажыццяўляюць імпартазамяшчэнне. Прычым, калі раней цэнтр працаваў з буйнымі прадпрыемствамі, прадстаўленымі на міжнародных рынках, сёння супрацоўнічае з арганізацыямі ўжо на этапе, калі яны толькі задумваюцца аб выхадзе на міжнародны ўзровень , — яшчэ можна папярэдзіць памылкі, звязаныя з абаронай інтэлектуальнай уласнасці: ад таварных знакаў да патэнтаў на распрацоўкі.

Немалаважны кірунак — і навуковыя даследаванні, на падставе якіх фармулююцца прапановы па ўдасканаленні заканадаўства і распрацоўваюцца метадычныя рэкамендацыі, адзначыў спікер. На гэты год цэнтрам запланавана вывучэнне пытанняў стану заяўнай актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пытанняў арганізацыі прававой аховы інтэлектуальнай уласнасці, сказаў Уладзімір Рабаволаў. Па выніках даследаванняў будуць выпрацаваны навукова-абгрунтаваныя прапановы для стварэння найбольш эфектыўнай сістэмы аховы ІУ, а таксама павышэння зацікаўленасці заяўнікаў у атрыманні прававой аховы на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. І, нарэшце, у полі зроку спецыялістаў — аптымізацыя падатковай нагрузкі для тых, хто ўносіць уклад у будучыню.

Яшчэ адзін немалаважны аспект, на які накіравана ўвага супрацоўнікаў НЦІУ, — павышэнне дасведчанасці грамадскасці ў сферы інтэлектуальнай уласнасці. На гэта разлічаны, у прыватнасці, спецыялізаваныя курсы цэнтра, якія штогод праходзяць больш за 500 чалавек. З мэтай папулярызацыі ведаў аб інтэлектуальнай уласнасці і неабходнасці яе аховы цэнтр праводзіць мерапрыемствы для ўсіх слаёў насельніцтва: ад конкурсаў для школьнікаў і студэнтаў да канферэнцый для прадстаўнікоў навукі і вытворчасці. І гэтая работа будзе працягвацца: так, сёлета ўпершыню адбудзецца конкурс «Найлепшы патэнт Беларусі» сярод праваўладальнікаў ужо дзейных патэнтаў на вынаходніцтвы і карысныя мадэлі.

## Ці ёсць што ахоўваць?

Безумоўна, сцвярджаюць навукоўцы. Прычым у многіх сферах. У якасці прыкладу можна ўзяць сельскую гаспадарку.

— У параўнанні з вялікімі кластарамі інтэлектуальнай уласнасці сарты сельскагаспадарчых раслін — кластар невялікі, але менавіта эфектыўная сістэма аховы сартоў раслін і ёсць падмурак устойлівага развіцця аграрнага сектара і адна з умоў харчовай бяспекі, — падкрэсліла **намеснік дырэктара Дзяржаўнай інспекцыі па выпрабаванні і аховe сартоў раслін Таццяна СЯМАШКА.**

На сучасным этапе развіцця сельскай гаспадаркі, пры шырокім укараненні інавацыйных тэхналогій атрымання сельгаспрадукцыі, ролю правільна выбраных сартоў пераацаніць складана, распавяла спецыялістка. Тым больш ва ўмовах змены клімату. Сорт павінен быць выбраны вельмі дакладна, бо 25 % прыросту ўраджаю адносіцца менавіта да гэтага фактару, дадала яна.

— Стварэнне новых сартоў раслін патрабуе ад селекцыянера працоўных і часавых выдаткаў (да 10—15 гадоў), а таксама значных ведаў. Адпаведна, селекцыянеру неабходны і механізм вяртання ўкладзеных інвестыцый. У нашай краіне з 1995 года функцыянуе сістэма аховы правоў селекцыянераў, — расказала Таццяна Сямашка. — Мінулы год стаў пачаткам вялікай работы. На сортавыпрабавальных станцыях былі арганізаваны патэнтныя ўчасткі, набыта тэхніка, вызначаны пералік сельскагаспадарчых раслін, найважнейшых для нашай краіны. Каб пастулаты Закона «Аб патэнтах на сарты раслін» не засталіся толькі на нацыянальным узроўні, у 2003 годзе Беларусь далучылася да Міжнароднай канвенцыі па ахове новых сартоў раслін, і нашы селекцыянеры здабылі права атрымліваць ахову свайго селекцыйнага вынаходніцтва на міжнародным узроўні.

Калі казаць аб дасягненнях у гэтай сферы, то ў мінулым годзе, паводле статыстыкі Міжнароднага саюза па ахове раслін, Беларусь увайшла ў топ-11 краін па колькасці дзейных патэнтаў разам з такімі гігантамі, як Расія, Кітай, ЗША.

«Спадзяёмся, што сёлета ўвойдзем у топ-10», — адзначыла Таццяна Сямашка.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

На слыху

# АШУКАНЦЫ ІДУЦЬ ДА ВАС

## Уліковыя даныя могуць выкрасці больш за 50 рэсурсаў, якія «гуляюць» у сетцы

**Спецыялісты ў галіне інтэрнэт-бяспекі б'юць трывогу з прычыны новай схемы кіберзлачынстваў, пры якой махляры ўжываюць падробленыя або фіктыўныя старонкі аўтарызацыі для выкрадання даных для ўваходу ў акаўнты карыстальнікаў месенджараў. Эксперт па міжбанкаўскай верыфікацыі, лічбавай трансфармацыі і прадпрымальнік з больш чым 15-гадовым вопытам работы ў сферы сувязі, фінансаў і развіцця бізнесу Тарас МЯНЯЙКІН даў парады, як пазбегнуць узлому і крадзяжу персанальных даных у сваіх месенджарах.**

### Не давярайце сумніўным крыніцам

Спецыялісты падкрэсліваюць, што зламыснікі нястомна ўдасканальваюць свае падыходы, цяпер арыентуючыся на больш дарослую аўдыторыю з выкарыстаннем тэм, звязаных з сямейнымі каштоўнасцямі, прадпрымальніцтвам і кар'ерным ростам, тым самым павялічваючы колькасць патэнцыяльных ахвяр. Яны арганізуюць фальшывыя каналы ў Telegram, прыцягваючы падробленымі прапановамі.

Як правіла, афёра пачынаецца з паведамлення, якое ўводзіць у зман. Напрыклад, нас заклікаюць падтрымаць дзіця ў конкурсе, і для гэтага трэба перайсці па прапанаванай спасылцы. Пасля пераходу па такіх спасылках карыстальнікі трапляюць на ашуканскія сайты, дзе для галасавання прапануецца ўвайсці праз месенджар або сацыяльную сетку, увёўшы нумар тэлефона і код пацвярджэння з СМС. Завалодаўшы гэтай інфармацыяй, злачынцы атрымліваюць доступ да акаўнтаў і пачынаюць распаўсюджваць фішынгавыя атакі і красці асабістыя даныя. «Нават калі вы атрымалі паведамленне ад чалавека, з якім размаўлялі нядаўна (ці даўно), з просьбай перайсці па спасылцы прагаласаваць і гэтак далей, звярніце ўвагу на манеру дыялогу. Напрыклад, вы заўсёды мелі зносіны на «ты» і свабодна, а цяпер сураз-моўца з вамі мае зносіны на «вы» і падазрона ветліва, — магчыма, з вамі мае зносіны махляр», — кажа Тарас Мяняйкін.

У якасці мер засцярогі наш эксперт раіць: пры атрыманні падазронага паведамлення трэба звязацца з адпраўшчыкам для праверкі яго сапраўднасці. У выпадку сумневаў лепш выдаліць паведамленне і пазбягаць пераходу па сумніўных спасылках. Не варта ўводзіць асабістыя даныя на сайтах з «шэрай» рэпутацыяй і ўключыць двухфактарную аўтэнтыфікацыю для ўзмацнення абароны акаўнту.

Калі ёсць падазрэнне на кампраметацыю акаўнту WhatsApp, варта неадкладна адключыць усе падазроныя сесіі. Карыстальнікам Telegram таксама рэкамендуецца правяраць актыўныя сесіі ў настройках і завяршаць усе невядомыя.

Варта ігнараваць нечаканыя прапановы і запыты, асабліва звязаныя з актывацыяй падпісак або ўдзелам у конкурсах. Заўсёды важна правяраць дакладнасць сайтаў, якія запытваюць увод асабістых даных, і не давяраць сумніўным крыніцам. Захаванне гэтых мер дапаможа значна ўзмацніць абарону вашых акаўнтаў у інтэрнэце.

### Падман пад выглядам «Беларусбанка»

Спецыялісты найбуйнейшага камерцыйнага банка паведамляюць, што ўсё часцей у інтэрнэце можна трапіць на фішынгавы сайт-інтэрнэт-рэсурс, візуальнае афармленне якога капіруе арыгінальную старонку інтэрнэт-банкінгу, афіцыйнага сайта belarusbank.by альбо сродкі індывідуалізацыі «Беларусбанка». Мэта ашуканцаў — атрымаць даныя кліентаў да ўліковага запісу інтэрнэт-банкінгу.

Такія фішынгавыя сайты могуць выглядаць падобна. Напрыклад, пад лагатыпам банка раптам высвеціцца такая інфармацыя, што акцыянернае таварыства «ААБ Беларусбанк Online-Work» дае заданне толькі для кліентаў банка. Прапануецца выканаць нескладаныя заданні па прасоўванні прадуктаў банка ў сацыяльных сетках Facebook і Instagram. Але для гэтага трэба запоўніць заяўку.

Спецыялісты па фінансавай бяспецы раяць наогул не звяртаць увагу на занадта «салодкія» прапановы. Яны рэкамендуюць заходзіць у сістэму «Інтэрнэт-банкінг» толькі з афіцыйнага сайта belarusbank.by альбо па прамым адрасе. Для атрымання інфармацыі аб прадуктах і паслугах карыстайцеся толькі афіцыйным сайтам банка, а таксама афіцыйнымі акаўнтамі ў сацыяльных сетках.

Калі вы ўсё ж увялі асабістыя даныя на фішынгавым сайце, неадкладна трэба заблакіраваць доступ да ўліковага запісу, патэлефанаваўшы ў кантакт-цэнтр «Беларусбанка» па нумарах 147.

**Сяргей КУРКАЧ.**

След на зямлі

# ТАТАЎ САД ПА-РАНЕЙШАМУ ЦВІЦЕ І РАДУЕ ЛЮДЗЕЙ СВАІМІ ПЛАДАМІ

**Гэта гісторыя пачалася ў далёкім 1946-м, калі сустрэліся і пажаніліся мае бацькі. Абодва яны — Рыгор і Клаўдзія — родам з вёсачкі Рудня, аднак знаёмыя не былі: тата, як многія, пасля за сямігодкі паехаў на вучобу ды заробкі ў далёкі Краматорск мама ў той час была яшчэ дзіцем.**

...Фашысты спалілі нашу вёску ў 1943-м на Узвіжанне, за дзень да вызвалення, ды яшчэ і прасачылі, каб згарэла датла. Напярэдсе была зіма. Вяскоўцы туліліся ў зямлянках. Многія, у тым ліку дзве малодшыя сястры майго таты, захварэлі і памерлі.

Будавацца пачыналі толькі вясною — хто як і хто з чаго, бо што маглі старыя, дзеці ды жанчыны? Мужчыны — хоць да некага — прыйшлі на дапамогу пазней, пасля Перамогі.

Мой будучы тата, старшы сяржант Рыгор Зольнікаў, вяртаўся дамоў у красавіку 1946-га. Мама, блакітнавокая прыгажуня, ішла да крыніцы па ваду — яму насустрач. Павіталіся, пазнаёміліся. Потым казалі, што сэрцы ёкнулі адразу, але размовы ды спатканні пачаліся пазней. Спачатку трэ было будавацца, шукаць работу ў райсэнтры: бог абодвух шчодра надзяліў і розумам, і талентам. Калі б не вайна, далёка пайшлі б...

Тата стаў працаваць у райвыканкаме, мама — у райсабесе. Разам пехатою хадзілі дамоў. Так нарадзілася каханне, а з ім — і сям'я.

Праз год з'явілася першая дачушка Людачка.

Месца ў свякроўчынай хаце як быццам хапала, але ж характар у гаспадыні быў вельмі наравісты. Мама, як потым казала, цярпела і зносіла ўсё — нікому не скардзілася. Але яе тата, мой дзядуля Сямён, паціху-памалу стаў нешта будаваць. Вяскоўцы думалі, лазеньку (памерам тры на тры), з двума акончамі. А калі справа дайшла да фінішу, стала ясна, што гэта... хацінка, асобнае жыллё — ну зусім нечаканы падарунак для маладой сям'і!

Потым да яго прыбудавалі маленькія сенцы, хлеў для жывёлы, выкапалі склеп. Тата адразу ж пасадзіў сад. Ён і сёння цвіце ды радуе людзей сваімі пладамі.

А ў той маленькай хаціне нарадзіліся яшчэ трое дзетак. Як цяпер бачу: самаробныя ложкі стаяць паабапал сцен, і я ў свае тры з паловай скачу з аднаго на другі праз усю нашу хатку.

Ці было там цесна? Далібог, не помню. Помню, што было... радасна. Мама выразала з газет прыгожыя «фіранкі», часта бяліла сцены і столь, а на печы малявала кветкі.

Дарэчы, там жа, у сваёй хацінцы, мы паставілі першую ў вёсцы ёлку, якую ўпрыгожвалі самаробнымі цацкамі (крамнай была хіба адна залацістая шышка, якую тата прывёз з Эстоніі).

Вясной мы хадзілі з мамай на грэблю слухаць канцэрты жаб. А ў грыбы і на рыбалку — гэта ўжо з татам. Начавалі ў шалашы каля возера, спявалі ваенныя песні.

У 1959-м сталі будаваць больш прасторны дом, як па мне — дык сапраўдны палац, так званую пяцісценку! Саша, малодшы з дзяцей, нарадзіўся ўжо там.

Бацькам, ну вядома ж, цяжка было працаваць, будавацца, гадаваць пяцёра дзяцей, але ў хаце ніколі не было сварак. Мы старанна вучыліся, змаглі атрымаць добрую адукацыю і работу па абраных прафесіях, часта пісалі бацькам, пры першай магчымасці, як на крылах, ляцелі дамоў.

...Калі я была ў пятым класе, у мамы пачаліся праблемы з сэрцам. Хуткую дапамогу з райсэнтра чакаць было доўга

і страшна, але ж пакінуць родную хату бацькі не рашаліся. Толькі летам 1979-га яны перабраліся ў Клімавічы. Я тады была студэнткай геафака, вярнулася з вытворчай практыкі і ўбачыла на дзвярах замок. Суседзі пацвердзілі мае здагадкі, назвалі новы адрас бацькоў, а галоўнае — далі ключ ад хаты.

З хваляваннем пераступіла родны парог, пакратала рукамі знаёмыя рэчы, перабрала ў думках пражытыя гады, потым пайшла ў сад-агарод.

Грады зелянелі, яблыні, грушы, слівы згіналіся пад цяжарам пладоў. Усё пасмакавала і ўсяго назбірала з сабой, гадзіны праз дзве знайшла патрэбны адрас. Радасць ад сустрэчы не мела межаў! Ды і хата мне спадабалася: амаль цэнтр горада, зялёная вуліца...

Там дажывалі свой век бацькі. А ў Рудню мы наязджалі, каб назбіраць грыбоў і ягад, налавіць ды насушыць рыбы, садзілі город. Толькі 20 гадоў таму татаў зруб сястра перавезла пад Мінск на дачны ўчастак. У вёсцы засталася толькі печ, а потым і яе разабралі на цэглу.

...Я даўно не была на малой радзіме, бо далёка і не маю здароўя. Але ж туды наязджаюць родзічы, якія жывуць бліжэй. Яны і расказваюць, што татаў сад жыве, цвіце, таполя і бярозы, якія саджалі старэйшыя сёстры, па-ранейшаму растуць. А нядаўна ў вёску, на радзіму дзядоў, прыязджаў пляменнік з сынам: усё абышлі, напіліся вады з калодзежа, пастаялі на падмурку... Даслалі шмат фота і відэа. Эмоцый — не перадаць! Хіба што ў вершах:

*Мясцінкі мілыя — век не забуду я.*
*Перад нябёсамі за вас малюсь:*
*За вёску родную, што звалі Рудняю,*
*За хату бацькаву, за Беларусь!*

**Наталля Сівак (Зольнікава),**

*Чэрвеньскі раён.*

Ёсць пытанне

# Што рабіць з перарослым альвасам?

**У нас дома некалькі старых вазонаў з альвасам (алоэ). Выкінуць іх шкада, бо гэтай раслінай наша бабуля, як расказвалі, лячыла свой цукровы дыябет, матуля — насмарк і раны... Буду ўдзячная, калі падкажаце, як з дапамогай соку ўмацаваць імунітэт і пазбавіцца ад перхаці.**

**Таццяна Маркаўна,**

*Мінскі раён.*

— З альвасу (алоэ) і сапраўды можна прыгатаваць цудоўныя сродкі для надання прыгажосці скуры і валасам, — пагадзілася **біёлаг, аўтар курса па стварэнні фітакасметыкі сваімі рукамі Вольга БУКАТ.** — Але перш-наперш расліну трэба паліць.

Праз два тыдні пасля гэтага, калі адбудуцца патрэбныя працэсы накаплення, зразаем самыя буйныя (не менш чым трохгадовыя) ніжнія лісты, абмываем, на некалькі гадзін уніз чаранкамі ставім у шклянку з вадой, каб выдаліць пякучае рэчыва алаін. Затым загортваем у паперу і на два тыдні кладзём у халадзільнік. Пасля гэтага я рэкамендую лісце заліць невялікай колькасцю вады і прабіць блэндарам. Атрымаецца прыгожая ізумрудная вадкасць з мякаццю. Яе можна прафільтраваць праз адзін-два слаі марлі ці дробнае сіта. Сок, які атрымаецца, я люблю замарозіць у кубікі лёду ці дадаць кансервант, каб даўжэй захоўваўся ў халадзільніку, і потым рыхтаваць маскі для твару ды валасоў.

Калі непакоіць перхаць і сверб скуры на галаве, добра спрацуе маска. Для яе прыгатавання спатрэбіцца 2 ст. л. алею (аліўкавага, какосавага, касторавага, з лопуху), 2 ст. л. соку алоэ, 1 ч. л. вадкага мёду (загусцелы можна разагрэць на вадзяной лазні). Усе інгрэдыенты добра перамешваюцца, наносяцца на скуру галавы і трымаюцца пад шапачкай для душа і ручніком 1-3 гадзіны, пасля чаго змываюцца шампунем. Тады валасы робяцца бліскучымі, дагледжанымі — нават з першага прымянення.

Рэцэпт маскі для твару: 1 ст. л. лыжка смятаны, 1 ст. л. соку/гелю алоэ, 1 ч. л. мёду, 1 ч. л. адвару рамонку ці зялёнага чаю. Зноў жа ўсе інгрэдыенты змешваюцца, трымаюцца на скуры 7-10 хвілін (калі адчуваеце, што маска пачала высыхаць, наносьце наступны слой) і змываюцца цёплай вадой.

Акрамя таго, сок алоэ сапраўды вельмі карысна прымаць унутр. Ён валодае антыдыябетычным дыспрацьзапаленчым эфектамі і ў той жа час, як і алей абляпіхі, стымулюе клетачнае дзяленне, таму ў яго прыёме ўнутр абавязкова трэба рабіць перапынкі на адзін-два месяцы.

Перад тым як піць, атрыманы сок алоэ трэба нагрэць (не вышэй за 50 градусаў!) — хвілін 20 патрымаць на вадзяной лазні. Пад уздзеяннем тэмпературы вадкасць набудзе цёмна-карычневы колер. Яе мы будзем захоўваць у халадзільніку. Ужываць трэба наступным чынам: 1 ст. лыжку соку разбаўляць у 100 мл вады, дадаваць штосьці кіслае, бо чысты сок алоэ вельмі горкі. Менавіта таму раней яго прымалі з мёдам, кагорам, спіртавымі настойкамі, але я не рэкамендую гэта рабіць... Лепш выціснуць сок з лімона, апельсіна, грэйпфрута альбо дадаць пракіслага бярозавіку ці чайную лыжку яблычнага воцату.

Кіслата ліквідуе горыч, і сок становіцца не толькі карысным, але і дастаткова смачным. Гэту гаючую вадкасць выпіваем на працягу дня — перад сняданкам, абедам і вячэрай, альбо, калі ёсць праблемы са страўнікам, падчас ежы. І яшчэ: соку алоэ не трэба гатаваць шмат, дастаткова 200 мл, бо ў халадзільніку без кансервантаў ён можа захоўвацца ўсяго некалькі тыдняў.

На аснове соку алоэ вера можна зрабіць таксама і ўвільгатняльны гель. Для гэтага ў аптэцы ці ў крамах, дзе прадаюцца інгрэдыенты для стварэння натуральнай касметыкі, можна купіць натуральны загушчальнік — гуаравую ці ксантанавую камедзь, гліцэрыну — рэчыва, у якім мы будзем яго размешваць, а таксама кансервант.

Каб прыгатаваць 100 мл гелю алоэ вера, бяром 50 мл вады і дадаём туды пяць кропель кансерванту, каб гель захоўваўся год, размешваем стэрыльным венчыкам (загадзя апрацаваным спіртам ці патрыманым у кіпні). У другой шклянцы растваряем 1 грам камедзі ў 5 мл гліцэрыны. Слізь, якая ўтварылася, дадаём да нашай вады з кансервантам і хутка перамешваем. У выніку яна загусцее — атрымаецца прыемная цягучая кансістэнцыя, да якой дадаём сок алоэ (50 мл). Пры жаданні — эфірныя алеі ды 2-3 кроплі вітаміну Е. Добра ўзбіваем венчыкам ці капучынатарам і пераліваем у стэрыльны флакон з цёмнага шкла для захоўвання (абавязкова падпісваем дату прыгатавання).

Гель можна наносіць на твар, валасы, ён з'яўляецца цудоўнай асновай для стварэння натуральнай касметыкі — крэмаў, ласьёнаў, тонікаў.

**Запісала Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Весткі з месцаў

# «Прывітальная» — для імяніннікаў!

**Юбілейнай праграмай «Залатыя струны творчасці» адзначыў сваё 60-годдзе адзін з самых аўтарытэтных і любімых калектываў Смаргоншчыны — народны ансамбль песні і танца імя М. К. Агінскага. Ён, створаны ў 1964-м на базе харавога і танцавальнага калектыву, з неймавернымі абаротамі набіраў папулярнасць, рос (у ім прымалі ўдзел больш чым сто чалавек — людзі розных узростаў і прафесій), станавіўся знакамітым як на Радзіме, так і за мяжой.**

Не дзіва, што святочная канцэртная праграма ансамбля сабрала ў раённым цэнтры культуры і верных прыхільнікаў, і былых удзельнікаў, і людзей пажылых, якія разам з песнямі хацелі ўспомніць сваю маладосць, і тых самых маладых...

На працягу ўсяго мерапрыемства ў глядзельнай зале панавала ўтульная, можна сказаць, хатняя атмасфера. У выкананні імяніннікa пад жывую музыку прагучалі кампазіцыі «Прывітальная», «Ясная зара», знакаміты «Паланэз», новыя аўтарскія песні і, вядома ж, найшчырэйшыя віншаванні і найлепшыя пажаданні найперш кіраўнікам ансамбля — Тамары Іванаўне Валчанковай і Аляксандру Палікарповічу Ляху, які, дарэчы, кіруе яшчэ і вакальным ансамблем у сталічным тэхналагічным універсітэце.

Адзін з удзельнікаў гэтага калектыву Мікалай Цытавец прыехаў у Смаргонь, каб разам адсвяткаваць такую шматзначную дату, падзівіцца ўзнагародам і выканаць новую кампазіцыю «Жыві і квітней, родная Беларусь».

**Анастасія Зайчук,**

*г. Смаргонь.*

# БАЯВОЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАЙВЫШЭЙШАГА ЎЗРОЎНЮ

## Партызанскі след у Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён»

**Істотны ўклад у вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў унеслі партызаны. На тэрыторыі нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі створаны 213 партызанскіх брыгад і 258 асобных атрадаў, з акупантамі гераічна змагалася звыш 374 тысяч народных мсціўцаў. З самага першага дня акупацыі партызаны не давалі спакойнага жыцця гітлераўцам і іх памагатым: здзяйснялі дыверсіі на чыгунцы і іншай інфраструктуры ворага, знішчалі фашыстаў і іх тэхніку, узбраенне, здабывалі найкаштоўнейшую інфармацыю. І колькі б фальсіфікатары ваенных падзей ні лілі бруду на партызан, народны характар партызанскай барацьбы прадэманстраваў выключны гераізм савецкага народа, які рабіў усё магчымае і немагчымае дзеля Перамогі.**

Герой Савецкага Саюза Віктар Лівенцаў разам з удзельніцай Мінскага падполля, партызанкай, Героем Савецкага Саюза Марыяй Осіпавай і іншымі баявымі таварышамі на святкаванні 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (Мінск, 1974 г.).

Баявое ўзаемадзеянне партызан з часцямі Чырвонай Арміі — асаблівасць Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён», у ходзе якой наша краіна была поўнасцю вызвалена. Аперацыя з'яўляецца класічным прыкладам творчага прымянення партызанскіх сіл у адной з вызначальных бітваў Вялікай Айчыннай вайны.

### ДОБРАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І НАДЗЕЙНАЯ СУВЯЗЬ

Баявыя дзеянні партызан Беларусі атрымалі высокую ацэнку савецкага камандавання. Усе задачы, пастаўленыя перад народнымі мсціўцамі Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання, былі паспяхова выкананы. Як і задумвалася, партызаны дэзарганізоўвалі саперніка, зрывалі падвоз яго рэзерваў да лініі фронту, перашкаджалі аператыўнаму перакідванню войскаў паміж франтамі. Для гэтага напярэдадні наступлення савецкіх войскаў партызанам была аказана вялікая дапамога камандаваннем чатырох франтоў: яны далі народным мсціўцам неабходную колькасць выбуховых рэчываў і боепрыпасаў.

Да лета 1944 года на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 272 тысячы партызан, аб'яднаных у 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў. Акрамя таго, у гэты час на акупаванай тэрыторыі рэспублікі вялі барацьбу больш за 60 тысяч падпольшчыкаў. Гэтыя вялізныя сілы народных мсціўцаў размяшчаліся ад лініі фронту да дзяржаўнай граніцы і займалі зручнае становішча для нападу на ўсе камунікацыі нямецка-фашысцкай арміі. Яны валодалі выдатным узбраеннем, уключаючы процітанкавыя стрэльбы, мінамёты і гарматы, значным досведам барацьбы, добрай арганізацыяй і надзейнымі сродкамі сувязі.

### 17 ТЫСЯЧ ПАРТЫЗАН СУПРАЦЬ 60-ТЫСЯЧНАЙ ВАРОЖАЙ ГРУПОЎКІ

Асабліва непакоілі ворага партызанскія зоны. На акупаванай тэрыторыі Беларусі было 20 партызанскіх зон, у якіх налічвалася больш за 400 тысяч партызанскага рэзерву. Толькі ў адной Полацка-Лепельскай зоне пад аховай народных мсціўцаў знаходзілася

Кіраўнікі КП(б)Б і партызанскага руху Беларусі. У першым радзе злева направа (сядзяць): В. І. Казлоў, П. К. Панамарэнка, Ф. І. Паўлоўскі, В. З. Корж; у другім радзе злева направа (стаяць): Р. Н. Мачульскі, П. З. Калінін, Ф. Ф. Капуста, І. Л. Сацункевіч, А. Г. Бондар (Беларусь, май 1943 г.).

Поспехі ўзаемадзеяння партызан і рэгулярных войскаў залежалі ад стану сувязі, таму і ёй удзялялася асаблівая ўвага. Да пачатку аперацыі ў тыле ворага дзейнічала 130 радыёстанцый, якія забяспечвалі рэгулярную і надзейную сувязь. Акрамя таго, штабы франтоў і войскаў накіроўвалі ў партызанскія фарміраванні сваіх радыстаў для каардынацыі сумесных баявых дзеянняў у тыле ворага. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі і афіцэры сувязі, закінутыя ў тыл саперніка.

1220 населеных пунктаў з насельніцтвам звыш 73 тысяч чалавек. Полацка-Лепельскае злучэнне партызан налічвала 17 тысяч байцоў. На іх узбраенні было 9 тысяч вінтовак, 700 кулямётаў, 1577 аўтаматаў, 78 ПТР, 108 мінамётаў і 19 гармат рознага калібру. Камандаваў гэтым злучэннем Герой Савецкага Саюза, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і БШПР Уладзімір Лабанок.

Полацка-Лепельская зона знаходзілася ў непасрэдным аператыўным тыле 3-й танкавай арміі вермахта. Каб ліквідаваць пагрозу з тылу, нямецка-фашысцкія захопнікі вырашылі вясной 1944 года знішчыць партызан. Амаль 60 тысяч нямецкіх войскаў былі кінуты супраць патрыётаў. Кіраваў аперацыяй камандуючы 3-й танкавай арміяй генерал Рэйнгард. Лютыя баі партызан

Камандзір партызанскага атрада «За Савецкую Беларусь» А. І. Валынец і яго 13-гадовы сын Мікалай (Беларусь, 1944 г.).

супраць сіл карнікаў, якія перайзыходзілі ў некалькі разоў, доўжыліся больш за тры тыдні. За гэты час авіяцыя саперніка (па нямецкіх даных) скінула на партызан больш за 500 тон бомбаў, іх бесперапынна атакавалі нямецкія танкі і пяхота, але знішчыць народных мсціўцаў фашысцкаму камандаванню не ўдалося. Гераічна змагаючыся, партызаны аказалі ворагу жорсткае супраціўленне. На жаль, панеслі значныя страты і патрыёты.

Шматлікія буйныя аперацыі акупантаў супраць беларускіх партызан, праведзеныя ўвесну 1944 года, не былі паспяховымі для ворага. Яны прыносілі саперніку буйныя страты і вымотвалі яго войскі, што ў канчатковым выніку мела вялікае значэнне для будучага наступлення Чырвонай Арміі.

Дырэктывай ЦК КП(б)Б і БШПР ад 8 чэрвеня 1944 года партызанскім брыгадам і атрадам ставілася задача нанесці ўсімі сіламі і паўсюдна магутныя ўдары па чыгуначных камунікацыях саперніка і паралізаваць яго перавозкі на лініях Мінск — Брэст, Полацк — Маладзечна, Орша, Маладзечна — Вільнюс і інш. У ноч на 20 чэрвеня 1944 года беларускія партызаны атакавалі чыгуначныя камунікацыі групы армій «Цэнтр» на ўсёй працягласці ад лініі фронту да дзяржаўнай граніцы.

### АДВАЖНЫЯ РАЗВЕДЧЫКІ

У ходзе падрыхтоўкі наступальнай аперацыі «Баграціён» перад партызанамі стаялі задачы па зборы звестак аб саперніку, характары яго абароны, перагрупоўцы рэзерваў. Так, ваенны савет 4-й ударнай арміі абавязаў камандзіраў партызанскіх атрадаў Віцебскай вобласці здабываць планы абарончых сістэм у раёне гарадоў і на граніцы перад фронтам арміі, даведвацца аб намерах і задумах саперніка, захопліваць палонных. Аб узгодненай рабоце ваенных і партызанскіх разведчыкаў сведчаць шматлікія факты.

У прыватнасці, у Магілёўскае партызанскае злучэнне была закінута група ваеннай разведкі на чале з капітанам П. А. Крылатых. Яна працавала сумесна з партызанскімі разведчыкамі, перадавала ў разведаддзел 2-га Беларускага фронту звесткі аб канцэнтрацыі сіл праціўніка ў Оршы, Горках, Магілёве, аб размяшчэнні складоў з гаручым і боепрыпасамі, аб знаходжанні перапраў праз Днепр.

У справаздачы разведвальнага аддзела 2-га Беларускага фронту за чэрвень 1944 года паведамлялася, што камандаванне фронту шырока ўжывалася засылка груп разведчыкаў на самалётах з пасадкай на аэрадромах партызан пад кіраўніцтвам памочніка начальніка 4-га аддзела штаба фронту маёра У. А. Емяльянава. У раён на паўднёвы захад ад Магілёва ім былі закінуты дзве групы: адна — пад камандаваннем камандзіра пешай разведкі 362-й стралковай дывізіі Героя Савецкага Саюза малодшага лейтэнанта С. Л. Ушакова, другая — пад камандаваннем камандзіра роты 238-й стралковай дывізіі лейтэнанта А. С. Скуратоўскага. Імі было ўстаноўлена, што ў Панізоўі засяроджана 120 танкаў, каля 170 бронемашын, якія належалі 70-й механізаванай нямецкай дывізіі. Пры садзейнічанні партызан былі захоплены палонныя і дакументы, выкрыта групоўка 4-й і часткова 9-й армій саперніка на ўчастку п. Горкі, што на паўднёвым захадзе ад Быхава.

Вось што пісаў камандзір адной разведвальнай групы ў справаздачы аб рабоце ў тыле саперніка: «З чэрвеня 1944 г. прыбылі ў раён дзеяння партызанскай брыгады тав. І. К. Захарава. У камандаванні брыгады падрабязна даведаліся пра абстаноўку на шляху нашага руху. Пасля аднадзённага адпачынку з дапамогай партызан-праваднікоў прайшлі міма ўсіх варожых гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Шлях за 120 кіламетраў пераадолелі за 5 дзён. 8 чэрвеня 1944 г. паспяхова прыбылі ў прызначанае месца і прыступілі да выканання пастаўленай задачы». У адрас Беларускага штаба партызанскага руху рэгулярна перадаваліся па рацыях важныя звесткі аб праціўніку з усіх акупаваных абласцей рэспублікі.

Толькі за пяць месяцаў 1944 года партызанскімі разведчыкамі Беларусі было захоплена 5865 аператыўных дакументаў, выяўлена наяўнасць у тылавых раёнах групы армій «Цэнтр» 900 гарнізонаў, 985 абарончых збудаванняў і рубяжоў, 70 буйных складоў. Напярэдадні наступлення савецкіх войскаў летам 1944 г. партызанамі Беларусі былі ўдакладнены месцы дыслакацыі штаба групы армій «Цэнтр», штабоў 3-й танкавай, 2, 4 і 9-й палявых армій і 60 штабоў карпусоў, дывізій і часцей, выяўлены шэраг абарончых рубяжоў на Віцебскім, Магілёўскім і Гомельскім напрамках. Многія з гэтых звестак рэгулярныя войскі атрымалі ўпершыню. Беларускія партызаны і падпольшчыкі зафіксавалі ў першым паўгоддзі 1944 года 21 397 эшалонаў ворага, якія прайшлі па чыгунках рэспублікі, на шашэйных і грунтавых дарогах імі была вызначана перакідка 1360 танкаў, 351 бронемашыны і вялікай колькасці грузавых і легкавых аўтамашын. Апрацоўка і супастаўленне атрыманых даных ад воінаў і партызан дазвалялі савецкаму камандаванню больш поўна выкрываць задумы і планы саперніка, устанаўліваць яго моцныя і слабыя бакі, прымаць правільныя рашэнні ў аперацыях.

Увесь свет даведаўся аб адважных беларускіх партызанах, якія дапамагалі Чырвонай Арміі набліжаць Перамогу. Фашысцкія генералы прызнавалі: партызанская вайна моцна ўплывала на маральны дух нямецкіх салдат.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Барыс ДАЎГАТОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
24 красавіка 2024 г. № 16 (749)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ, ПАДТРЫМАНАЯ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ

**У рэспубліканскім суботніку 20 красавіка прынялі ўдзел каля трох мільёнаў беларусаў. Свой уклад у навядзенне парадку на зямлі ўнеслі і члены Савета Рэспублікі**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі на чале са Старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ, работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі працавалі ў парку імя 40-годдзя Вялікага Кастрычніка ў Мінску.**

Фота: тэлеграм-канал Савета Рэспублікі.

«Гэта на карысць нашага горада, нашай краіны, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. — Мы ганарымся чысцінёй, дагледжанасцю нашых вуліц, паркаў, сквераў. Нярэдка людзі не задумваюцца, якая гэта цяжкая праца. Праца тых людзей, якія займаюцца гэтым кожны дзень, — работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, прадпрыемстваў, арганізацый. Каб Беларусь заўсёды заставалася такой цудоўнай і дагледжанай, мы павінны цаніць гэта. Той, хто сёння прыме ўдзел у суботніку і папрацуе, лішні раз ужо не кіне паперку і паспрабуе захаваць цудоўную прыроду, якая ёсць у нашай краіне, чысціню і добраўпарадкаванасць нашых вуліц».

Трэба шанаваць, берагчы і перадаваць традыцыю суботнікаў сваім дзецям, упэўнены старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы. «Бачыце, дзеці прыйшлі сёння на суботнік разам з татамі і мамамі. Яны ўжо далучыліся да гэтага. Гэта своеасаблівы такі патрыятычны парыў нашых людзей. Зрабі краіну лепшай, прыгажэйшай, багацейшай, любі яе — вось гэта самае галоўнае, — падкрэсліў ён. — І выдатна, што ёсць такая магчымасць паўдзельнічаць у суботніку».

Многія сенатары працавалі падчас суботніка ў рэгіёнах, са сваімі калектывамі.

Наталля Марковіч і Сяргей Мялешкін разам з кіраўніцтвам Ушацкага раёна Сяргеем Садоўскім, дэпутатамі райсавета, працоўнымі калектывамі, мясцовымі жыхарамі працавалі на добраўпарадкаванні абеліска ў вёсцы Слабада. Барыс Ціхаміраў разам з работнікамі структурных падраздзяленняў Аршанскага райвыканкама закладваў яблыневы сад на тэрыторыі Бабініцкай сярэдняй школы. Канстанцін Сіроцін прыняў удзел у рэспубліканскім суботніку на родным прадпрыемстве «Магілёўхімвалакно», добраўпарадкоўваючы тэрыторыю. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Магілёўшчыны Аляксандр Гарошкін сумесна з кіраўніцтвам Магілёўскага аблвыканкама наводзіў парадак на тэрыторыі гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, дзе ідзе будаўніцтва новага корпуса.

Члены Савета Рэспублікі ад Гомельскай вобласці суботнік правялі ў вёсцы Красны Бераг Жлобінскага раёна, дзе на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Помнік дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» быў высаджаны яблыневы сад.

Аляксандр Карпіцкі разам з калектывам Брэсцкай абласной бальніцы наводзіў парадак у найбліжэйшай лесапаласе. Алег Румо разам з супрацоўнікамі Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі, які ён узначальвае, добраўпарадкоўвалі тэрыторыю цэнтра і прылеглай алеі. Гарык Барсамян працаваў разам з калектывам Мінскай раённай бальніцы, добраўпарадкоўваючы прылеглыя тэрыторыі.

Аляксандр Новікаў сумесна з віцэ-прэм'ерам Пятром Пархомчыкам і міністрам прамысловасці Аляксандрам Рагожнікам высаджваў алею ў гонар 30-годдзя Мінпрама і 60-годдзя ААТ «Інтэграл». Ілья Ікан разам з працоўным калектывам завода «Полацк-Шкловалакно» добраўпарадкоўваў Алею Герояў Савецкага Саюза ў парку імя 50-годдзя Савецкай улады ў Полацку...

І гэта далёка не ўсе прыклады ўдзелу сенатараў у суботніку, які ўжо ўспрымаецца як частка жыцця краіны. Суботнік — добрая традыцыя беларусаў, якая аб'ядноўвае многія пакаленні, адзначалі парламентарыі, падтрымліваючы гэтую традыцыю не словам, а справай.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

## Прыём грамадзян, устойлівае развіццё, Форум рэгіёнаў

### Падрабязнасці работы членаў верхняй палаты парламента

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб:**

**30 красавіка 2024 г. у г. Мінску;**

**2 мая 2024 г. у г. Жлобіне ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Гомельскай вобласці.**

***Як запісацца на прыём да Наталлі Качанавай, а таксама дзе і калі будуць працаваць у раёнах Гомельскай вобласці іншыя члены Савета Рэспублікі, можна даведацца ў тэлеграм-канале Савета Рэспублікі і на афіцыйным сайце sovrep.gov.by***

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Сівец прыняў удзел у семінары, прысвечаным Міжнароднаму дню інтэлектуальнай уласнасці. Размова ішла ў тым ліку і аб дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У сваім выступленні ў рамках пленарнага пасяджэння семінара Сяргей Сівец асаблівы акцэнт зрабіў на тое, як уплываюць однабаковыя прымусовыя меры на рэалізацыю МУР: «Санкцыйная палітыка наносіць страты працэсу шматбаковасці ў справе дасягнення МУР, у тым ліку палітычным механізмам і інстытутам для прадухілення і рэгулявання канфліктаў мірнымі сродкамі, падрывае правы найбольш уразлівых пластоў насельніцтва, у тым ліку ў сферы справядлівага ўдзелу ў палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці, парушае іх псіхасацыяльны дабрабыт».

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск» Глеб Лапіцкі прыняў удзел у абласным штабе па падрыхтоўцы аб'ектаў горада Віцебска да XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

«Нам трэба прыняць гасцей высокага ўзроўню. Усе службы горада поўнасцю гатовы выканаць будаўнічыя работы якасна і ў тэрмін. Важна, што ўсё створанае будзе радаваць віцябчан не толькі ў дні правядзення Форуму рэгіёнаў, але і застанецца гараджанам своеасаблівым падарункам да юбілею: Віцебску сёлета спаўняецца 1050 гадоў», — адзначыў сенатар.

Удзельнікі штаба наведалі шэраг аб'ектаў гарадской інфраструктуры і сэрвісу. Сярод ключавых пляцовак — канцэртная зала «Віцебск». Штодня на аб'екце працуюць каля 270 чалавек. У высокай ступені гатоўнасці фасадныя, дахавыя работы і работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Праводзяцца будаўнічамантажныя і пусканаладачныя работы. У шэрагу памяшканняў — фінішнае аздабленне, камплектаванне абсталяваннем і мэбляй.

На пасяджэнні штаба прынята рашэнне, што з 22 красавіка графік работ на аб'екце стане двухзменным, што дасць магчымасць паскорыць тэмпы будаўніцтва. Асаблівая ўвага ўдзяляецца забеспячэнню бяспекі знаходжання грамадзян у месцах правядзення масавых мерапрыемстваў.

ВЯРШЫНЯ НАРОДАЎЛАДДЗЯ

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ НА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ СХОДЗЕ

## Сёння ў найвышэйшым прадстаўнічым органе дзяржаўнай улады пачынаюць працаваць дэпутаты з Саветаў усіх узроўняў з усіх рэгіёнаў нашай краіны

**АД МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ У СКЛАД УНС ВЫБРАНА 290 ДЭЛЕГАТАЎ**

**АД МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ У СКЛАД УНС У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ УВАЙШЛІ 60 ДЭПУТАТАЎ**

**КОЛЬКАСНА-ЯКАСНЫ СКЛАД ДЭЛЕГАТАЎ УНС АД МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ**




**328** ЧАЛАВЕК МАЮЦЬ ВЫШЭЙШУЮ АДУКАЦЫЮ

**13** ЧАЛАВЕК МАЮЦЬ ВУЧОНАЕ ЗВАННЕ, ВУЧОНУЮ СТУПЕНЬ

**51** ЧАЛАВЕК МАЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

**СФЕРЫ ДЗЕЙНАСЦІ:**

- 75 ПРАМЫСЛОВАСЦЬ , ТРАНСПАРТ, БУДАЎНІЦТВА
- 59 АДУКАЦЫЯ
- 29 АХОВА ЗДАРОЎЯ
- 16 МУС, МНС, МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ
- 44 АГРАПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС
- 13 ЖКГ, ГАНДАЛЬ, БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ
- 23 КУЛЬТУРА, БАНКАЎСКАЯ СПРАВА, СМІ
- 91 ІНШЫЯ

**ПАРТЫЙНАСЦЬ:**

158 ЧАЛАВЕК ПАРТЫЯ БЕЛАЯ РУСЬ

16 ЧАЛАВЕК

13 ЧАЛАВЕК

2 ЧАЛАВЕКІ ЛДПБ

Паводле інфармацыі Цэнтрвыбаркама.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «МЫ ПРАЦУЕМ ДЗЕЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ правёў першы на гэтай пасадзе асабісты прыём грамадзян. Да кіраўніка дэпутацкага корпуса паўночнага рэгіёна звярнуліся больш за 10 чалавек.**

Месцам сустрэчы народа з уладай стала жыллёва-эксплуатацыйнае ўпраўленне № 22 горада Віцебска, куды паступае каля 15 працэнтаў зваротаў ад усёй колькасці 11 падобных устаноў горада. Як расказаў Дзмітрый Дзямідаў, людзям прасцей прыйсці да ўлады на месцах, чым дабрацца да кабінетаў. Тым больш, як паказвае практыка, большасць зваротаў грамадзян датычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, таму, каб вырашыць праблемы грамадзян аператыўна і з карысцю, першы прыём быў праведзены ў ЖЭУ. «Такая практыка дазваляе ўбачыць зрэз актуальных пытанняў. Думаю, што мае калегі таксама заўважаць эфектыўнасць гэтай формы работы з насельніцтвам і возьмуць яе ў свой арсенал», — падкрэсліў кіраўнік дэпутацкага корпуса.

Жыхар шматпавярхоўкі на вуліцы Петруся Броўкі, 11 расказаў, што жыхары дома сутыкнуліся з праблемай каналізацыі ў падвале. Мужчына распавёў, што за два тыдні яна цякла чатыры разы. Праблема заключаецца не толькі ў трубах, часткі якіх ужо прыйшлі ў непрыдатнасць, але і ў забруджванні сродкамі гігіены і смеццем. Прадстаўнікі ЖЭУ адзначылі, што каналізацыю ўжо прачышчалі, вывешвалі аб'явы для жыхароў аб недапушчальнасці выкідвання ў каналізацыю буйнога смецця. Заяўніку паабяцалі замяніць праблемны ўчастак труб з чыгунных на пластыкавыя. Сантэхнікі былі накіраваны на адрас у гэты ж дзень. «У гэтым пытанні значную ролю адыгрывае калектыўная адказнасць жыхароў дома за здарэнні. Пакуль што ў нас гэта развіта слаба. Аднак вада камень точыць, трэба праводзіць з людзьмі растлумачальную работу», — адзначыў Дзмітрый Дзямідаў.

Заяўніца з пяціпавярхоўкі ў мікрараёне Білева паскардзілася на адсутнасць напору вады. Праблема цягнецца ўжо некалькі месяцаў. Прычым у яе суседзяў з ніжніх паверхаў такое пытанне не стаіць, а вось да пятага паверха напор не даходзіць. Жанчына адзначыла, што на працягу многіх гадоў пакідае жадаць лепшага і тэмпература вады, якая трымаецца на ўзроўні 43-45 градусаў. І быццам бы выйшла са строю абсталяванне, аднак старшыня таварыства ўласнікаў не аказвае ніякай дапамогі. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны даручыў у найбліжэйшы час накіраваць спецыялістаў для абследавання з указаннем канкрэтных тэрмінаў выканання рамонтных работ, а таксама зрабіць пераразлік за той перыяд, калі паслугі аказваліся неналежным чынам.

Мужчына, які жыве на праспекце Будаўнікоў, прыйшоў на прыём не са скаргамі, а з прапановамі. Так, заяўнік адзначыў, што ў іх мікрараёне не хапае пляцоўкі для міні-футбола. Ён разам з двума сынамі і астатнія дзеці былі б вельмі рады, калі б мясцовыя ўлады паспрыялі ў вырашэнні такога пытання па добраўпарадкаванні. Напярэдадні з жыхарамі было праведзена пасяджэнне, дзе абмяркоўвалася гэта магчымасць. Як адзначылі адказныя службы, поле для міні-футбола са спецыяльным пакрыццём, агароджай і асвятленнем па стандартных памерах з-за адсутнасці свабоднай тэрыторыі не можа быць пабудавана. «Давайце вырашаць праблему паступова. Спачатку прывядзём у парадак зялёную зону, паставім вароты. А потым, гледзячы на зваротную сувязь ад дзяцей і моладзі, будзем будаваць пляцоўку», — прапанаваў Дзмітрый Уладзіміравіч. Заяўнік таксама дадаў, што ў мікрараёне ёсць праблема з выгулам сабак на зялёнай зоне з улікам таго, што спецыяльна адведзеныя пляцоўкі пад гэта ёсць. «Трэба аднавіць шыльды, якія тлумачаць аб адказнасці за выгул хатніх гадаванцаў. А суседзі, якія будуць заўважаць парушальнікаў, могуць паведамляць у ЖКГ ці АУС. Думаю, што, атрымаўшы штраф адзін раз, гаспадары будуць больш адказна ставіцца да чысціні вакол», — адзначыў Дзямідаў.

Будаўніцтва мікрараёна «Арэхава» — яшчэ адна праблема, агучаная падчас прыёму. У далёкім 2015 годзе сем'і, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, атрымалі там участкі. Прайшло дзевяць гадоў, многія пабудавалі дамы, аднак паўнавартасна жыць у іх не могуць праз адсутнасць не толькі дарог, але і асноўных камунікацый. І калі газ і электрычнасць летась усё-такі правялі, вада і каналізацыя дагэтуль застаюцца пад пытаннем. Неналежным чынам вядзе работы падрадчык будоўлі, не хапае рабочых рук і фінансавання. Старшыня аблсавета даручыў адказным службам да канца красавіка пракласці неабходныя камунікацыі і да сярэдзіны мая здаць у эксплуатацыю сістэму водазабеспячэння.

Жыхарка дома, у якім і праходзіў прыём, папрасіла аднавіць пешаходную дарожку, што некалькі дзесяцігоддзяў таму была заасфальтаванай і зручнай. Выявілася, што ў плане дома такога аб'екта не было, а маладзёжная брыгада, якая шчыравала на будаўніцтве, вырашыла зрабіць з рэшткаў матэрыялаў своеасаблівы праход, да якога звыкліся мясцовыя жыхары. «Нягледзячы на тое, што ў плане яе няма, трэба аднавіць дарожку. Вам нескладана, а людзі будуць удзячны», — звярнуўся да кіраўніцтва ЖЭУ дэпутат.

Падчас прыёму былі агучаны пытанні неналежнага функцыянавання сістэмы ацяплення, а таксама будоўлі па праспекце Будаўнікоў, з якой мясцовыя жыхары катэгарычна не згодныя. Усе пытанні старшыня Віцебскага аблсавета ўзяў на асабісты кантроль і падкрэсліў, што па тым, як вырашаюцца праблемы ЖКГ, людзі мяркуюць аб рабоце ўлады. «Таму ні адзін зварот не павінен быць пакінутым без увагі адказных службаў. Мы працуем дзеля людзей», — заключыў Дзмітрый Дзямідаў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

ШКОЛА ДЭПУТАТА

# Вопыт, ініцыятыва, галоснасць

## Магілёўскі аблсавет правёў першы адукацыйны семінар для дэпутатаў 29 склікання

**Быць дэпутатам — місія ганаровая і вельмі адказная. Вучоба дае магчымасць навучыцца здымаць вострыя пытанні і эфектыўна працаваць з насельніцтвам. Нядаўна Магілёўскі аблсавет запрасіў дэпутатаў 29-га склікання на першы семінар. Народныя выбраннікі мелі магчымасць асвоіць прававыя асновы, якімі прыйдзецца карыстацца ў рабоце, як працаваць са зваротамі грамадзян, узаемадзейнічаць з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і актыўнымі грамадзянамі, папулярызаваць сваю дзейнасць праз масмедыя. Удзел у рабоце семінара, які прайшоў пад старшынствам кіраўніка аблсавета Аляксандра ГАРОШКІНА, прынялі старшыні гарадскіх, раённых, сельскіх Саветаў. У якасці спікераў выступілі прадстаўнікі структурных падраздзяленняў аблвыканкама, дасведчаныя дэпутаты.**

### Найлепшыя практыкі

Вопытам арганізацыі работы ў Савеце падзялілася **дэпутат Магілёўскага аблсавета па Казіміраўскай выбарчай акрузе № 42 Ірына РАІНЧЫК.** Яна расказала пра формы дзейнасці дэпутата і падкрэсліла важнасць чарговых і пазачарговых сесій. Добрай практыкай яна назвала выязныя сесіі, дзе ёсць магчымасць разгледзець дзейнасць мясцовага Савета базавага ўзроўню з удзелам прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і маладзёжнага парламента. Дэпутат звярнула ўвагу на дзейсныя формы калегіяльнай работы у выражэнні складаных пытанняў, стварэнне пастаянных і часовых дэпутацкіх груп.

— У мінулым скліканні пры аблсавеце дзейнічала дэпутацкая група грамадскай арганізацыі «Белая Русь», — прывяла яна прыклад. — Члены групы ва ўзаемадзеянні з органамі выканаўчай улады і грамадскімі арганізацыямі праводзілі дыялогавыя пляцоўкі па вырашэнні пытанняў развіцця партыйнага будаўніцтва, захавання міру і згоды, традыцыйных каштоўнасцяў. Ствараліся рабочыя групы па разглядзе зваротаў грамадзян. Станоўча зарэкамендавалі сябе і адзіныя тыдні справаздач дэпутатаў у выбарчых акругах, і адзіныя дні прыёмаў дэпутатамі ўсіх узроўняў. Сумеснымі намаганнямі прасцей выявіць недахопы ў рабоце з насельніцтвам і знайсці найбольш канструктыўныя шляхі вырашэння пытанняў грамадзян.

Адным з яркіх прыкладаў папулярызацыі дэпутацкай дзейнасці стала правядзенне сумесна з Асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў першага рэгіянальнага форуму «Мясцовае самакіраванне ў Магілёўскай вобласці «Ініцыятыва. Адзінства. Дзеянне. Вынік». На працягу некалькіх дзён удзельнікі абмяркоўвалі пытанні развіцця мясцовага самакіравання вобласці, студэнцкага і вучнёўскага самакіравання, ролю маладзёжных парламентаў у рабоце з моладдзю. Падчас форуму працавалі тэматычныя секцыі, праводзіліся віктарыны, круглыя сталы, дыялогавыя пляцоўкі, выстаўкі. Адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў абласнога спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання, што яшчэ больш натхніла людзей на навядзенне парадку і прыгажосці ў сваіх населеных пунктах.

У народных выбранніках ёсць добрая магчымасць пашырыць межы дзейнасці за кошт міжнароднага і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Наладзіць стасункі дапамагае Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сёлета ён будзе працаваць у Віцебскай вобласці.

Станоўчы эфект прыносіць работа з Маладзёжным парламентам. Хлопцы і дзяўчаты, якім цікава займацца грамадскай дзейнасцю, вельмі актыўныя і амбіцыйныя. З іх падачы ў вобласці рэалізавана ўжо шмат карысных праектаў і акцый, у тым ліку з удзелам іх аднагодкаў з расійскіх рэгіёнаў.

Вельмі спрыяюць згуртаванню дэпутатаў спартыўныя мерапрыемствы. Магілёўская вобласць адзіная, дзе праводзяцца зімовая і летняя спартакіяды. На думку Ірыны Раінчык, гэта дае магчымасць удзельнікам падзяліцца карысным вопытам і надзённымі праблемамі ў неформальнай абстаноўцы.

### Звароты як індыкатар работы

У чэрвені 2019 года адбыўся рэспубліканскі семінар-пасяджэнне, прысвечаны актуалізацыі метадаў і форм работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні, з удзелам Прэзідэнта. «Эфектыўная работа з насельніцтвам — гэта індыкатар прафпрыдатнасці кіраўніцтва і вобласці, і раёна, і асобна ўзятага прадпрыемства, — рэзюмаваў на той сустрэчы кіраўнік дзяржавы. — Скаргі — паказчык недапрацовак. А прызванне дэпутата — дапамагчы канкрэтнаму чалавеку».

Падчас семінара старшыня аблсавета Аляксандр Гарошкін арыентаваў калег на якасную і добрасумленную работу са зваротамі грамадзян.

— Дэпутат павінен ісці не туды, дзе ўсё добра, а туды, дзе ёсць праблемы, — адзначыў ён. — І шукаць магчымасці, як зрабіць, а не як не рабіць. І галоўны наш памочнік у вырашэнні пытанняў — выканаўчая ўлада.

**Начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Ына ФІЛІПАВА** нагадала пра тыя нарматыўна-прававыя дакументы, якія рэгулююць работу са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. Яна падрабязна расказала пра Закон аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, які дзейнічае ў рэдакцыі ад 17 чэрвеня 2023 года, і яго тыповыя парушэнні: гэта фармальны падыход да разгляду зваротаў, адсутнасць канкрэтнага адказу, валакіта, незахаванне тэрмінаў разгляду і гэтак далей.

Выразная ўстаноўка на вырашэнне ўсіх праблем і пытанняў ад насельніцтва ў першую чаргу непасрэдна на месцах дадзена ў Дырэктыве Прэзідэнта № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржапарату і павышэнні жыццядзейнасці насельніцтва» ў новай рэдакцыі ад 13 чэрвеня 2023 года. «Зняць напружанасць і шэраг пытанняў дапамагае своечасовая інфармацыйна-тлумачальная работа, — заўважыла Ына Філіпава. — Трэба таксама развіваць парталы электронных паслуг, праводзіць рэйтынгавую ацэнку якасці аказання паслуг і іншых платформ.

Карысна ў рабоце са зваротамі грамадзян абапірацца на Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь. Пяты артыкул яго якраз прысвечаны гэтай тэме.

### На ўмовах галоснасці

Работа дэпутата публічная, і жыхары павінны ведаць, чым займаецца канкрэтна іх абраннік. І гэта той выпадак, калі прадстаўнічая ўлада зацікаўлена ў папулярызацыі сваёй дзейнасці. Пра важнасць і эфектыўнасць інфармацыйнай прапаганды расказала **начальнік упраўлення па рабоце са СМІ галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Алена ДЗІВАКОВА.**

— Пастаяннае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне органаў мясцовага самакіравання са СМІ з'яўляецца адным з механізмаў правядзення дзяржпалітыкі, інфармавання насельніцтва аб прыманых заканадаўчай уладай рашэнняў, аб дзейнасці дэпутацкага корпуса, — падкрэсліла яна. — Сёння эфектыўным сродкам народзі з традыцыйнымі СМІ стаў інтэрнэт, а таксама сацыяльныя сеткі і месенджары. З іх дапамогай аператыўна даносіцца важная інфармацыя, ажыццяўляецца зваротная сувязь.

Магчымасці для галоснасці ў рэгіёне вялікія. На тэрыторыі вобласці функцыянуе 26 газет з аўдыторыяй болей чым 100 тысяч чалавек, тры дзяржтэлеканалы, дзве радыёпраграмы, 18 сеткавых выданняў, дзевяць сайтаў СМІ, 197 акаўнтаў дзяржаўных СМІ ў сацыяльных сетках і месенджарах з агульнай аўдыторыяй болей чым 700 тысяч падпісчыкаў.

Аляксандр Гарошкін звярнуў увагу яшчэ і на тое, што дэпутат павінен уважліва ставіцца да той інфармацыі, якую дае. Па-першае, казаць толькі пра тое, у чым упэўнены, а не разважаць наконт таго, чаго не ведае. Па-другое, разумець наступствы сваіх слоў. Па-трэцяе, калі нешта паабяцаў — зрабіць.

### Праз ініцыятывы да супрацоўніцтва

Вялікую пазітыўную ролю ў рабоце з насельніцтвам адыгрывае Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, якая функцыянуе ў рэгіёне з 2015 года. Асноўнымі кірункамі дзейнасці асацыяцыі з'яўляецца садзейнічанне органам мясцовага самакіравання ў адукацыйнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і кансультацыйнай сферах, падтрымка мясцовых ініцыятыў, Мэт устойлівага развіцця, міжнародная і дабрачынная дзейнасць, прапаганда здаровага ладу жыцця.

**Дырэктар асацыяцыі Паліна ЦЕРАШКОВА** параіла дэпутатам больш абапірацца на работу органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Гэта тыя ініцыятыўныя грамадзяне, якія гатовы аператыўна вырашаць праблемы насельніцтва і з'яўляюцца галоўнымі памочнікамі органаў улады на месцах.

Выступоўца расказала, як дэпутат можа падтрымаць ініцыятыўных грамадзян з дапамогай асацыяцыі. За пяць гадоў на падтрымку 206 ініцыятыў грамадзян гэта арганізацыя выдзеліла каля 530 тысяч рублёў.

У якасці карыснага дапаможніка для работы ў выбарчай акрузе ўдзельнікі семінара атрымалі «Дзённік дэпутата». У ім выкладзены асновы заканадаўчай базы ў сферы мясцовага кіравання і самакіравання, абазначана роля і месца дэпутата ва ўзаемадзеянні з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадзянамі і грамадскімі арганізацыямі. У дзённіку прапаноўваюцца ўзоры дакументаў, якія дапамогуць народнаму абраннику больш эфектыўна працаваць. Тут жа размешчаны механізм падтрымкі ініцыятыў грамадзян, які летась быў распрацаваны на рэспубліканскім узроўні. Дзякуючы яму ініцыятыўныя жыхары маюць магчымасць штогод на конкурснай аснове атрымліваць фінансаванне з абласнога бюджэту на рэалізацыю сваіх праектаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# КУРС МАЛАДОГА БАЙЦА ДЛЯ ДЭПУТАТА

**У аграгарадку Яроміна Гомельскага раёна Аляксандр Курэц з сям'ёй жыве чацвёрты год. За гэты час малады бацька сямейства паспеў праявіць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю і заваяваў давер людзей. Аляксандра спачатку выбралі старшынёй Маладзёжнага савета пры Яромінскім сельвыканкаме, а пасля на выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў у адзіны дзень галасавання — дэпутатам Яромінскага сельскага Савета дэпутатаў. Ён самы малады народны выбраннік у сваім сельсавеце і адзіны дэпутат сярод сваіх калег па службе.**

## Не ў службу, а ў дружбу

Аляксандр Курэц — начальнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці Веткаўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Сам родам з Віцебскай вобласці. Скончыў Гомельскі ўніверсітэт грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь. На Гомельшчыне маладым курсантам знайшоў сваё сямейнае шчасце. Пасля вучобы чатыры гады служыў у Жлобінскім раёне. Па месцы службы мужа-ратавальніка паехала працаваць і маладая жонка Аляксандра — Аліна Курэц. Яна ўрач-акушэр-гінеколаг. У сям'і падрастае сын Макар, а два месяцы таму ў маладых бацькоў нарадзілася дачка Арына. Жыве сям'я ратавальніка і ўрача ў аграгарадку Яроміна Гомельскага раёна. Менавіта з пераездам у сельскую мясцовасць зусім нечакана для маладога бацькі і прафесійнага ратавальніка пачалася яго грамадская дзейнасць.

— Я вясковы, і ў горадзе на паверсе мне было вельмі цяжка, калі жылі ў Гомелі. Купілі спачатку лецішча ў Гомельскім раёне, а потым і жонцы, якая была выключна гарадскім чалавекам, так спадабалася загараднае жыццё, што сталі шукаць дамок у вёсцы, — згадвае Аляксандр. — Рады, што пасяліліся ў Яроміне. Гэта, вядома, вельмі буйны сельскі населены пункт, ёсць абсалютна ўся інфраструктура, каб жыць і гадаваць дзяцей.

З юнацтва вельмі актыўны, Аляксандр, як толькі пераехаў жыць на новае месца, падпісаўся на профіль Гомельскага раёна ў сацыяльнай сетцы. Цікавіўся фатаграфіямі і ролікамі аб мерапрыемствах у розных вёсках.

— Мне спадабалася, што можна пабачыць, як і чым жывуць людзі ў розных населеных пунктах, але было мала навін аб нашым Яроміне, і я напісаў аб гэтым каментарый да аднаго з пастоў. Не ведаў тады, хто мадэрыруе профіль, як гэта ўвогуле адбываецца, і здзівіўся, што мне вельмі аператыўна адказалі. Адказаў жыхар нашага Гомельскага раёна, вядомы актывіст, старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Станіслаў Сямёнаў. Ён прапанаваў сустрэцца, — расказвае Аляксандр.

Хапіла паўгадзіны размовы з самым вядомым маладым актывістам Гомельскага раёна, каб заразіць прафесійнага ратавальніка жаданнем распачаць свой першы грамадскі праект. Аляксандр пазнаёміўся з кіраўніцтвам Яромінскага сельсавета. У хуткім часе яго выбралі старшынёй маладзёжнага савета пры сельвыканкаме. Дапамагаў у арганізацыі суботнікаў і розных мерапрыемстваў у аграгарадку. Паралельна стварыў і пачаў весці групу ў сацыяльнай сетцы для жыхароў сельсавета. Літаральна за пару месяцаў вясковая анлайн-супольна Аляксандра Курца аб'яднала больш за 600 чалавек.

## Вясковы эфір

— З-за таго, што ў жыхароў нашых увогуле не было ніякай агульнай групы, асноўны мой пасыл быў у вырашэнні штодзённых пытанняў, інфармацыйная дапамога. Пачаў з самага простага, а, як аказалася, важнага для нашых жыхароў — кантактнай інфармацыі ўсіх сацыяльна значных аб'ектаў. Прасоўваў групу, дарэчы, спачатку праз бацькоўскія чаты школы і спартыўных гурткоў, куды ходзіць мой сын. Даслаў запрашэнні далучыцца ў групу. Сёння, крыху больш чым за год існавання, у нашай групе 1400 чалавек, — тлумачыць Аляксандр.

Іх група — адлюстраванне жыцця ў аграгарадку: ад фотарэпартажаў з усіх масавых свят да важнай інфармацыі ад адказных службаў. Вядзе групу Аляксандр Курэц самастойна.

— Некалькі разоў з моманту заснавання групы праводзіў сацыяльныя апытанні, што людзі хочуць бачыць у ёй. Было важна, каб чат не ператвараўся ў «барахолку», куды скідаюць аб'явы аб продажы. За гэтым трэба было асабліва спачатку сачыць і папярэджваць, што група гэта інфармацыйная. Прапанаваў праз галасаванне вызначыць, што для нас кантэнт дарэчны і што — недарэчны. У «бане» ў нас паштоўкі, якія засмечваюць «эфір». Але людзі, напрыклад, прагаласавалі за аб'явы аб правядзенні кірмашоў, рэалізацыі прадукцыі сельгаспрадпрыемстваў на тэрыторыі нашага сельсавета. Просяць размяшчаць інфармацыю аб вакансіях на прадпрыемствах, якія працуюць на тэрыторыі нашага сельсавета. Пішу таксама аб'явы ад камунальных прадпрыемстваў: калі, напрыклад, будзе адключэнне святла і на якіх вуліцах, інфармую аб прыёме ўчастковага інспектара міліцыі і шмат яшчэ аб чым, што хвалюе і цікавіць нашых жыхароў, — дадае малады дэпутат.

## Рабіць камандай

Калі Аляксандр прыняў рашэнне вылучыць сваю кандыдатуру ў дэпутаты сельскага Савета дэпутатаў, пайшоў па дамах збіраць подпісы, а заадно правёў жывое апытанне ў людзей, ці карысная для іх група, якую ён вядзе. Крытычныя заўвагі былі, але жыхары Яроміна адназначна падтрымалі такі сацыяльны праект Аляксандра.

— У жыцці нашага аграгарадка такі анлайн-камунікат рэальна прыносіць свой плён. Напрыклад, у групе ўзнялі праблему захламленасці завулка паміж вуліцай Новай і школай. Вырашылі сабрацца і навесці парадак на дарозе, па якой ходзяць нашы дзеці. Правялі міні-суботнік — і ўсё, праблему вырашылі. Плённае выкарыстанне групы і як пляцоўкі, дзе можна падзяліцца інфармацыяй, фатаграфіямі, відэа з мерапрыемстваў, якія праходзяць у нашым клубе, — кажа Аляксандр.

Да Дня абаронцаў Айчыны ён арганізоўваў вясковы чэмпіянат па падцягванні для хлапчукоў і іх тат. Спартыўную залу дала ДЮСШ Гомельскага раёна, а ахвотнікаў прыняць удзел у спаборніцтве Аляксандр склікаў таксама ў агульным чаце. Сам вырабіў дыпломы для ўзнагароджання. Нядаўна малады яромінскі дэпутат перадаў у сельскі клуб набыты няновы стол для настольнага тэніса. Работнікі яго падрамантавалі, пафарбавалі. Аляксандр таксама праз групу запрашае прыходзіць у клуб і гуляць.

— Паўплываць на развіццё свайго населенага пункта можа любы актывіст, які хоча працаваць з людзьмі, мае жаданне дапамагаць, і няважна, колькі яму гадоў, якая ў яго адукацыя, хто ён па прафесіі. Я, напрыклад, не хачу мірыцца з тым, што нашы дзеці шмат часу праводзяць у тэлефонах: яны такія ж актыўныя і энергічныя, як мы ў іх узросце, але і нам, дарослым, трэба паказаць прыклад спартыўнай актыўнасці. Не перастаю радавацца, колькі ўсяго ў нашым населеным пункце зроблена для дзяцей, каб яны вучыліся, займаліся спортам, развіваліся і фізічна, і творча. Як толькі ёсць магчымасць, іду з сынам гуляць у футбол на стадыён у нашым аграгарадку. Цяпер, як дачка нарадзілася, дык і яе ў калясачцы бяром з сабой. Вы б бачылі, колькі дзяцей збіраецца. Вельмі хацелася б, каб гэта ўсё падтрымлівалі і заўважалі бацькі. Заахвоціць іх таксама, думаю, дапаможа наша агульная група, — спадзяецца Аляксандр.

Дэпутат кажа, што і ў службе, і ў грамадскай рабоце сям'я — яго надзейны тыл: без падтрымкі жонкі Аліны не справіўся б.

— Цяпер у мяне новы этап у жыцці. Толькі вучуся, што значыць быць дэпутатам. На нейкім яшчэ юнацкім максімалізме вельмі шмат ідэй адразу хочацца ажыццявіць. Але я для сябе вызначыў, што працаваць варта разам камандай дэпутатаў, каб ідэі ўсе старанна абмяркоўваліся. Цяпер у мяне дэпутацкі курс маладога байца, яшчэ трэба вельмі шмат чаму вучыцца не толькі ў іншых народных выбраннікаў, але і ў людзей, што жывуць побач, — прызнаецца малады дэпутат.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва героя матэрыяла.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.766. Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2024 года.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# ЛІТАРАТУРНЫМІ СЦЕЖКАМІ ІВАЦЭВІЧЧЫНЫ

Палац Пуслоўскіх і сядзіба Касцюшкаў. Косава-Мерачоўшчына. Рэпрадукцыя малюнка Напалеона Орды.

**Сёлета, на пачатку верасня 2024-га, Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Івацэвічах. Адпаведна, і ўвага ўжо ў самыя бліжэйшыя месяцы будзе прыцягнута да Івацэвіч і яго ваколіц, да іх гістарычнай і літаратурна-краязнаўчай памяці.**

Паспрабуем і мы ажыццявіць віртуальнае падарожжа па літаратурных сцежках гэтай старонкі. Пачнём з саміх Івацэвічаў. Да паселішча, якое знаходзіцца за 135 км ад Брэста, можна дабрацца і па чыгунцы. Раённы цэнтр з'яўляецца яшчэ і чыгуначнай станцыяй на лініі Брэст — Баранавічы. Івацэвічы ўпершыню згадваюцца ў 1508 годзе — праз запіс у зэльвенскай касцёльнай кнізе. Першыя вядомыя ўладальнікі — Ільінічы. Некалі, да Радзівілаў, яны валодалі і Мірскім замкам. Са смерцю Юрыя Ільініча ў 1569 годзе род згас. Сярод уладальнікаў паселішча былі слонімскі суддзя Ян Віктарына, Ян Юр'евіч Багуматка, Стэфан Кандзяжэўскі... З 1784-га маёнтак Івацэвічы — ва ўладанні пана Яна Сяплюцкага. З 1795 года паселішча — у складзе Расійскай імперыі, спярша ў Слонімскай губерні, затым у Літоўскай і нарэшце з 28 жніўня 1802 года — у Гродзенскай губерні...

З адкрыццём Маскоўска-Варшаўскай шашы (1846) у 1848 годзе запрацавала Івацэвіцкая паштовая станцыя. А калі была ўведзена ў эксплуатацыю чыгунка Варшава — Масква (1871), то ў паселішчы з'явілася і чыгуначная станцыя... Такімі былі вытокі Івацэвіцкай гісторыі, паселішча, якое прайшло і праз многія выпрабаванні, часам надзвычай драматычныя, у XX стагоддзі.

А што да літаратурных памятак і згадак, то найперш, відаць, у Івацэвічах варта наведаць Івацэвіцкую раённую бібліятэку імя Піліпа Пестрака. Знаходзіцца яна па вуліцы Савецкай, 24. Імя аднаго з вядомых празаікаў сярэдзіны XX стагоддзя асветніцкая ўстанова носіць невыпадкова. На Івацэвіччыне, у вёсцы Сакоўцы, і нарадзіўся Піліп Пестрак (1903—1978). Шкада, што неяк даволі скупа, праз рэдкія згадкі ў медыя, было заўважана летась 120-годдзе з дня нараджэння пісьменніка... Хаця ў 2003 годзе да 100-годдзя Піліпа Пестрака была выпушчана нават паштовая картка з арыгінальнай маркай. Асоба пісьменніка легендарная. У час Першай сусветнай вайны разам з сям'ёю знаходзіўся ў бежанстве ў Самарскай губерні. У 1920 годзе паступіў на сацыяльна-гістарычны факультэт Самарскага ўніверсітэта. А праз год разам з бацькамі вярнуўся ў Заходнюю Беларусь. Працаваў лесніком у Косаўскім лясніцтве (Косава — мястэчка, горад за 15 км ад Івацэвічаў; па часе згадвання ў пісьмовых крыніцах датай яго нараджэння лічыцца 1494 год). У Косаве будучы пісьменнік і прычыніўся да рэвалюцыйнай работы. У 1926—1927 гг. выбіраўся членам Косаўскага павятовага камітэта Беларускай сялянска-работніцкай грамады. З 1927 года — сакратар Косаўскага райкама Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У друку ўпершыню выступіў у 1927 годзе — у часопісе «Родныя гоні». Выданне праіснавала нядоўга, у сакавіку — кастрычніку выйшла ўсяго пяць нумароў. У 1929 годзе польскія ўлады арыштавалі Піліпа Пестрака. Тэрмін зняволення ў Гродзенскай турме доўжыўся да 1933 года. Выйшаўшы на волю, малады рэвалюцыянер быў прызначаны інструктарам ЦК КПЗБ па Пінскай акрузе. А ў 1934 годзе зноў арыштаваны. Сядзеў (да 1939 года) у турмах Пінска, Вільні, Гродна. Змяшчаў свае вершы ў нелегальным рукапісным часопісе палітвязняў «Краты». Першы паэтычны зборнік Піліпа Пестрака пабачыў свет ужо пасля вызвалення Заходняй Беларусі, у 1940 годзе, — «На варце». Пісьменнік удзельнічаў у партызанскім руху ў час Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 года — на творчай працы. Тэме рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі прысвяціў раман «Сустрэнемся на барыкадах». Пасляваенную вёску апісаў у рамане «Серадзібор». За рэвалюцыйную дзейнасць і літаратурную працу Піліп Пестрак адзначаны ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), медалямі, яму прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР (1964). Імем пісьменніка названы вуліцы ў Гродне і Мінску. Сярод іншых вуліц Івацэвічаў, дзе і імёнамі пісьменнікаў, асветнікаў названы многія, — Максіма Танка, Яраслава Пархуты, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Пушкіна, Горкага, Францыска Скарыны, ёсць таксама вуліца Піліпа Пестрака. Мо з часам і даведнік літаратурна-краязнаўчы з'явіцца — «Івацэвіцкімі сцежкамі Піліпа Пестрака»?..



Косава-Мерачоўшчына.




Будаўніцтва тэлефоннага камутатара ў вёсцы Святая Воля.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў Івацэвічах бываў беларускі паэт Аляксей Зарыцкі. Вядомы і яго верш «Спатканне ў Івацэвічах»... Свой след на Івацэвіцкай зямлі пакінуў і вялікі рускі паэт Аляксандр Твардоўскі. Ён быў прызваны ў Чырвоную Армію ў 1939 годзе і прыкамандзіраваны да франтавой газеты «Часовой Родины». Дзякуючы намаганням А.Твардоўскага ў 1939 годзе ў Брэсце ў друкарні М. Таненбаума была выдадзена кніжачка «Франтавыя старонкі». Увайшлі ў гэта выданне і прыпеўкі, якія паэту (ці некаму з чырвонаармейцаў) перадалі дзяўчаты з Івацэвічаў.

Зазірнём у Косава. Пра повязь з паселішчам і яго ваколіцамі Пестрака мы ўжо згадвалі... Вандруючы гэтымі мясцінамі, абавязкова пазнаёмцеся з Косаўскім палацам — палацам Пуслоўскіх. Уладальнікамі Косава ў розныя часіны былі Храптовічы, Сангушкі, Флемінгі, Чартарыйскія, Сапегі. У 1821 годзе гаспадар маёнтка Войцах Пуслоўскі заснаваў у Косаве фабрыку дываноў. Палац, сядзібу Пуслоўскіх наведвалі мастак і музыкант Напалеон Орда, пісьменнікі Генрык Сянкевіч, Элізa Ажэшка, гісторык і пісьменнік Вацлаў Ластоўскі. У Косаве ў 1953 годзе нарадзіўся паэт, кінадраматург Уладзімір Мароз. Аўтар многіх кніг і аўтар сцэнарыяў дзясяткаў дакументальных фільмаў. Сярод іх — і фільм «Косава». За сваю работу ў кінадакументалістыцы Уладзімір Мароз адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

У івацэвіцкай вёсцы Мілейкі нарадзіўся празаік, паэт, краязнаўца, публіцыст Яраслаў Пархута (1930—1996). Аўтар кніг «Казка зялёнай дубровы», «Ты пайшла ў сонца», «Перапёлачка», «Зямля бацькоў нашых», «Дарогамі надзей і трывог: Палескі дзённік», «Крыніца ёсць у родным краі... Кніга падарожжаў», «Жальба жытняга коласа»... Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1992). Вось якім водгукам на прачытанае ў кнігах Яраслава Пархуты падзяліўся настаўнік Запалянскай васьмігодкі Івацэвіцкага раёна Алесь Фаміч Зайка: «Буду шчырым. Кніга ў пэўнай меры адкрыла для мяне вас як пісьменніка. І надзвычай уразіла. Чым? Майстэрствам слова... Ваша мова дакладная, простая, даверлівая, шчырая, як глыток крынічнай вады ў спякоту. Паверце, гэта не камплемент. Гэта канстатацыя найпрыемнейшага адкрыцця, факта...» Алесь Зайка (1928—2018), які нарадзіўся ў Заполлі, пахаваны на могілках у вёсцы Бялавічы, — і сам вядомы літаратар, краязнаўца. Яго творчая спадчына — «Дыялектны слоўнік Косаўшчыны», «Прыказкі і прымаўкі, жарты і каламбуры, прыгаворкі і язykаломкі, вясельныя прымаўкі пры дзяльбе каравая, вітанні і зычэнні, ветлівыя і ласкавыя выразы, засцярогі і прысяганні, праклёны і адкляцці, жартоўныя праклёны і дражнілкі-кепікі, зневажанні і параўнанні, прыкметы народнага календара з Косаўшчыны», «Дым з коміна», «Чысты чацвер», «Мікратапаніміка Івацэвіччыны».

З Івацэвіцкім краем звязаны лёсы такіх пісьменнікаў, як польскі паэт і празаік Багдан Драздоўскі (1931—2013), літаратуразнаўца, фальклярыст, Мікалай Грынчык (1923—1999)... У вёсцы Югалін у 1926 годзе нарадзіўся прапраўнук Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна — Георгій... Шмат у Івацэвічах і ваколіцах і іншых літаратурна-краязнаўчых памятак. Варта толькі ўважліва іх разгледзець!..

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

**Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса»**
220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18
**www.rrb.by**

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2024 | 31.12.2023 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 52 718 | 48 970 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 21 846 | 42 170 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 44 852 | 36 217 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 48 422 | 47 973 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 172 493 | 171 305 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 35 406 | 34 462 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 6 156 | 6 987 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 033 | 5 059 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 386 926 | 393 143 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 3 018 | 12 912 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 318 787 | 315 497 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 2 579 | 2 118 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 733 | 2 677 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 326 117 | 333 204 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 10 053 | 10 053 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 18 030 | 17 966 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 297 | 11 491 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 60 809 | 59 939 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 386 926 | 393 143 |

Форма 2

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках
31 марта 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2024 | 31.03.2023 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 019 | 5 842 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 718 | 3 143 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 301 | 2 699 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 741 | 2 443 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 496 | 398 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 245 | 2 045 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 12 | 11 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 384 | 3 057 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | (41) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (266) | 2 524 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 739 | 810 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 647 | 5 011 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 310 | 181 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 990 | 865 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 184 | 162 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 806 | 703 |

Председатель Правления Д.И. Омельянчик

Главный бухгалтер Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 16 апреля 2024 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 12 апреля 2023 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 08.05.2024.**

**Лот № 1: Зерноуборочный комбайн (кат.D),** модель КЗС-1420, заводской № 0007.
Начальная цена без НДС – 71 500,00 руб.
**Лот № 2: Зерноуборочный комбайн (кат.D),** модель КЗС-1420, заводской № 0008.
Начальная цена без НДС – 71 500,00 руб.
**Лот № 3: Комбайн зерноуборочный самоходный,** модель КЗС-1218, заводской № 05133.
Начальная цена без НДС – 45 600,00 руб.
**Лот № 4: Зерноуборочный комбайн (кат.D),** модель КЗС-1218-10, заводской № 03323.
Начальная цена без НДС – 27 250,00 руб.
**Лот № 5: Жатка для зерновых культур с транспортной тележкой КЗС-1218,** заводской № 2941.
Начальная цена без НДС – 3 100,00 руб.
**Лот № 6: Зерноуборочный комбайн (кат.D),** модель КЗС-1218-10, заводской № 04894.
Начальная цена без НДС – 45 600,00 руб.
**Лот № 7: Зерноуборочный комбайн (кат.D),** модель КЗС-1218, заводской № 1647.

Начальная цена без НДС – 30 400,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–7:**
Минская обл., Логойский р-н, аг. Гостиловичи.
Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
☎ **8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП gostorg.by.**

УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **ГП «Жилищник Минщины»** (арендодатель)
проводит открытый аукцион

**по продаже права заключения договора аренды торгового помещения**

**с инв. № 600/D-135658, общей площадью 889,4 кв. м, расположенного по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 98-66, для осуществления торговли.**
Срок заключения договора аренды – **3 года.**
Размер ежемесячной арендной платы – **800,46 базовых арендных величин**
*(без учета коэффициента для отдельных видов деятельности).*

**Начальная цена предмета торгов – 3 948,94 бел. руб.**
Аукцион состоится **23.05.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **21.05.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, Телефон для осмотра (8017) 510-08-53, сайт в сети интернет www.rlt.by.**
Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах: **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 691536750

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ

**Стайский сельский исполнительный комитет**

**проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № п.п. | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Начальная цена, рублей |
|---|---|---|
| 1 | Витебская область, Лепельский район, Стайский с/с, д. Старый Лепель, улица Радужная, 37, площадь 0,104 га, кадастровый номер 222783608601004462 | 4000,00 |

Аукцион состоится **30 мая 2024 года в 14.30** по адресу: Витебская область, Лепельский район, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.
Контактные телефоны: 8 (02132) 3-25-42, 3-25-74, (29) 3093358.
Извещение о проведение аукциона опубликовано на официальном сайте Витебского облисполкома, vitebsk-region.gov.by и Государственного комитета по имуществу, au.nca.by

УНП 300039704

Свидетельство о постановке на учет Замошской первичной организации Лельчицкого района Республиканской партии труда и справедливости **считать недействительным** в связи с утерей свидетельства.

УНП 100005489

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Шарковщинский агротехсервис»**

Аукцион состоится **20.05.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** пункт технического обслуживания с инв. № 223/С-9117, 848 кв. м.

Адрес: Витебская обл., Шарковщинский р-н, г. п. Шарковщина, ул. Вокзальная, 20Б/1.
Земельный участок площадью 1,4452 га с кадастровым номером 225555100010000386.
Право аренды с 04.11.2019 по 15.09.2044.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 660,30 руб.
Задаток – 366,03 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG».
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127807029001000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 17.05.2024 в 11.00.
Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 19.07.2022, 17.09.2022, 16.06.2023.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
☎ **8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail torgi@ino.by.**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **Белгосстрах** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

Аукцион состоится **16.05.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1:** павильон с инв. № 5944.

Начальная цена с НДС 20 % – 1918,52 руб.
**Местонахождение Лота № 1:**
Минская обл., Минский р-н, аг Колодищи, ул. Геофизика, 1Б (место временного хранения).
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
☎ **8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail torgi@ino.by.**

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Аукцион состоится **06.05.2024,** начало: 10.00, окончание: 16.00, на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: **с 24.04.2024 09.00 до 03.05.2024 16.00**

**Организатор аукциона, оператор ЭТП:**
ООО «Индустрия Инноваций»,
г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

| № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (наименование: **магазин,** назначение: торговое помещение), инвентарный номер: 134/D-3259, адрес: Брестская обл., Лунинецкий р-н, 13-2, 1,1 км северо-западнее д. Ситница, общая пл.: 370,2 кв. м | 16 909,91 | 10 145,95 |
| 2 | Изолированное помещение (наименование, назначение: **административное помещение),** инвентарный номер: 152/D-4863, адрес: Брестская обл., Лунинецкий р-н, 13-3, 1,1 км северо-западнее д. Ситница, общая пл.: 442,9 кв. м | 20 221,91 | 12 133,15 |

**Продавец:**
ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Иная информация о предмете, порядке проведения электронных торгов, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, в ранее опубликованном извещении о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 56 от 20.03.2024 (30190), стр. 15, а также на сайте ЭТП iintorgi.by

**Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

Информация о проведении аукциона (далее – Аукцион) по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в **д. Осово, д. Жажелка** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Аукцион состоится **23 мая 2024 г. в 10.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.
*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Осово, ул. Горького | 624881710301000048 | 0,1496 га | (1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 8 000,00 |
| 2 | д. Жажелка, ул. Заречная | 624881705601000183 | 0,15 га | | 9 000,00 |

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by.

УНП 600023532

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# У НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАЛЯНДАР ПЛАНУЮЦЬ УКЛЮЧЫЦЬ НОВЫЯ ПРЫШЧЭПКІ

## Як вакцыны выратоўваюць жыцці і чаго можа каштаваць іх ігнараванне?

**З 21 да 27 красавіка праводзіцца Еўрапейскі тыдзень імунізацыі. Яго мэта — нагадаць аб важнасці прышчэпак і хваробах, якія яны дапамаглі перамагчы. Напрыклад, сёння мы забылі пра такія небяспечныя інфекцыі, як воспа і поліяміеліт. Наш Нацыянальны каляндар уключае вакцынацыю ад 12 захворванняў. У найбліжэйшыя гады яго плануюць пашырыць. Напрыклад, разглядаецца пытанне прышчапляць ад коклюшу не толькі немаўлят, але і школьнікаў, а таксама рабіць прышчэпкі ад віруса папіломы чалавека, які выклікае рак. Пра небяспеку адмовы ад прышчэпак расказалі спецыялісты.**

### ШТО ДАЛО ПАЎСТАГОДДЗЯ ІМУНІЗАЦЫІ?

Сёлета спаўняецца 50 гадоў, як пачалася пашыраная праграма імунізацыі ва ўсім свеце, і ў тым ліку Еўрапейскім рэгіёне. Дзякуючы вакцынам удалося абараніць ад небяспечных хвароб некалькі пакаленняў. За апошнія паўстагоддзя вакцыны выратавалі жыцці больш чым мільярду людзей на планеце, а ў наступныя 50 гадоў, як мяркуецца, вакцыны змогуць абараніць людзей усіх узростаў ад яшчэ большай колькасці хвароб.

— Пашыраная праграма імунізацыі была створана ў 1974 годзе, каб усе дзеці ва ўсіх краінах маглі атрымліваць жыццёва важныя вакцыны супраць шасці патэнцыяльна смяротных хвароб: дыфтэрыі, поліяміеліту, коклюшу, слупняку, туберкулёзу і адру. З дапамогай пашыранай праграмы імунізацыі ліквідавана воспа. А вірус поліяміеліту цяпер цыркулюе толькі ў двух эндэмічных рэгіёнах, — расказвае **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі кіраўнік краінавага офіса СААЗ у Беларусі Сяргей ДЗІЁРДЗІЦА.**

Дзякуючы вакцынацыі ўдалося знізіць дзіцячую смяротнасць. Агульнасусветны паказчык скарачіўся з 92 смерцяў на тысячу жыванароджаных у 1974 годзе да 25,5 у 2024 годзе. На працягу пяці дзесяцігоддзяў нацыянальныя праграмы планавай імунізацыі развіваліся і пашыраліся. Сёння яны забяспечваюць вакцынацыю дзяцей і падлеткаў супраць як мінімум 13 сур'ёзных захворванняў.

— У Беларусі маецца каласальны вопыт, калі пераважная большасць мэтавых груп насельніцтва — 97-98 % — ахоплены вакцынацыяй ад усіх асноўных хвароб, якія можна папярэдзіць. Летась я ўручыў міністру аховы здароўя сертыфікат СААЗ аб дасягненні рэгіянальных мэтавых паказчыкаў барацьбы з гепатытам В шляхам імунізацыі як прызнанне моцнага боку беларускай сістэмы аховы здароўя. Улічваючы значныя дасягненні Беларусі ў барацьбе з вірусным гепатытам В, вялікі вопыт у галіне элімінацыі перадачы ад маці да дзіцяці віруса імунадэфіцыту чалавека і сіфілісу, мы спадзяёмся, што краіна разгледзіць магчымасць у будучыні падачы заяўкі на пацвярджэнне трайной элімінацыі, стаўшы адной з першых у Еўрапейскім рэгіёне, — падзяліўся Сяргей Дзіёрдзіца.

Прадстаўнік СААЗ адзначыў, што арганізацыя вітае намеры беларускага Міністэрства аховы здароўя ўключыць у найбліжэйшыя гады ў нацыянальны каляндар вакцынацыю супраць пнеўмакокавай інфекцыі для ўсіх дзяцей і супраць віруса папіломы чалавека.

— Хачу нагадаць, што рак шыйкі маткі — гэта хвароба, якая паддаецца прафілактыцы з дапамогай вакцын. Іх эфектыўнасць складае больш за 90 %, — адзначыў Сяргей Дзіёрдзіца.

**Калі дзіця не атрымала прышчэпку ад паратыту, у будучыні магчыма бясплоддзе. Калі жанчына не атрымала прышчэпку ад краснухі, то падчас цяжарнасці гэта можа адбіцца не толькі на здароўі маці, але і на здароўі будучага дзіцяці. Вакцыны прыдуманы не проста так, а для таго, каб выратаваць наша жыццё.**

У будучыні Еўропе яшчэ трэба будзе ў поўнай меры раскрыць усе перавагі вакцыны і скарыстацца імі. Усе дзяржавы — члены СААЗ Еўрапейскага рэгіёна адобрылі еўрапейскі парадак дня па імунізацыі на перыяд да 2030 года.

— Аднак мы не зможам скарыстацца перавагамі вакцынацыі, калі дзеці па тых ці іншых прычынах не будуць атрымліваць прышчэпкі. У апошнія тры гады каля 1 мільён 800 тысяч дзяцей па тых ці іншых прычынах прапусцілі вакцынацыю, — звярнуў увагу прадстаўнік СААЗ.

### У ЧЫМ НЕБЯСПЕКА АДРУ?

Як паведаміў **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ,** летась, як і ў папярэднія гады, у нашай краіне было забяспечана функцыянаванне сістэмы правядзення прафілактычных прышчэпак. Вакцынацыя забяспечыла Беларусі падтрыманне статусу краіны, свабоднай ад поліяміеліту, статусу элімінацыі адру і краснухі, таксама дасягнуты рэгіянальныя мэты кантролю віруснага гепатыту В. Колькасць інфекцый, якія кіруюцца вакцынапрафілактыкай, працягвае зніжацца ці заставацца стабільна нізкай па большасці пазіцый.

Пры гэтым ёсць адна небяспечная інфекцыя, колькасць выпадкаў якой рэзка выраслa ў Еўропе. Гэта адзёр. Летась ім заразіліся больш за 58 тысяч чалавек у 53 краінах Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Гэта прывяло да тысяч выпадкаў шпіталізацыі і дзясяткаў смерцяў. У Беларусі пачынаючы з лютага мінулага года таксама працягваюцца рэгістравацца выпадкі гэтага захворвання. Пры гэтым большасць захворэлых — асобы, старэйшыя за 18 гадоў. І больш за 70 % іх не былі прышчэплены.

— Небяспека адру ў тым, што гэта высокакантагіёзнае захворванне, якое вельмі лёгка распаўсюджваецца паветрана-кропельным шляхам. Груба кажучы, калі захварэе адзін чалавек у пад'ездзе шматпавярховіка, ёсць рызыка заражэння ўсіх жыхароў у гэтым пад'ездзе, калі яны не вакцынаваны супраць адру. Да таго ж любая інфекцыя ў асоб з аслабленым імунітэтам можа развівацца вельмі цяжка і прыводзіць да неспрыяльнага канца. Таму вакцынацыя супраць адру — адзіны на сёння абгрунтаваны метад прафілактыкі, дапамагае абараніць самога вакцынаванага і яго атачэнне, — тлумачыць Кірыл Ігнатаў.

Ён дадаў, што толькі дзякуючы выкананню нацыянальнага календара прафілактычных прышчэпак у Беларусі не развілася такая ж сітуацыя з адром, як у суседняй Расіі. Штогод у нашай краіне дасягаецца ўзровень вакцынацыі па прышчэпках, якія ўваходзяць у нацыянальны каляндар, на ўзроўні не ніжэй за 97 %. Ствараецца добрая імунная праслойка, якая дазваляе перарваць ланцужок распаўсюджвання інфекцыі ў папуляцыі.

— Адзёр пашкоджвае слізістыя: гэта кератыты (захворванне рагавой абалонкі вока) аж да слепаты, ларынгатрахеіты са стэнозам гартані, гэта вірусная адровая пнеўманія, якая не лечыцца антыбіётыкамі і закранае абодва лёгкія, адровы энцэфаліт з вострым перыядам пашкоджання галаўнога мозгу. Сярод аддаленых наступстваў праз 5-6 гадоў, і гэта падрабязна апісана ва ўсёй медыцынскай літаратуры, падвостры склерозавальны панэнцэфаліт, калі чалавек губляе памяць, — расказала пра небяспекі адру **дацэнт кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Наталля ГАЛЬКЕВІЧ.**

### ВЫРАСЛА ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ НА КОКЛЮШ

Кірыл Ігнатаў паведаміў, што сёлета выраслa захваральнасць на коклюш. Больш за палову захворэлых — школьнікі 7—14 гадоў. Вакцынацыя ад гэтай інфекцыі ўключана ў нацыянальны каляндар, прышчэпкі ставяцца ў 2, 3, 4 і 18 месяцаў. У сувязі з ростам захваральнасці школьнікаў абмяркоўваецца пытанне ўкаранення ў нацыянальны каляндар дадатковай дозы вакцынацыі супраць коклюшу ў шэсць гадоў.

— Але пакуль пытанне абмяркоўваецца. У папярэднія гады сітуацыя па коклюшы была вельмі спрыяльная — рэгістравалася ад 2 да 5 выпадкаў за год, бо ковід выцесніў усе іншыя рэспіраторныя захворванні, — патлумачыў Кірыл Ігнатаў.

Як паведаміла Наталля Галькевіч, сёння прышчапіцца ад коклюшу могуць і дарослыя. У нашай краіне з'явілася вакцына для дзяцей ад чатырох гадоў (усе астатнія для малых больш ранняга ўзросту). Яна падыходзіць і для дарослых, у тым ліку цяжарных жанчын.

— Мы пачынаем прышчапляць ад коклюшу дзяцей ва ўзросце двух месяцаў. Першы імунітэт фарміруецца прыкладна праз тры тыдні. Такім чынам, у тры месяцы ён яшчэ недастатковы, каб супрацьстаяць гэтай сур'ёзнай хваробе. У чым яе сур'ёзнасць? Коклюшны таксін уздзейнічае на дыхальны цэнтр і выклікае яго парабіёз, ад чаго наступае спыненне дыхання — апноэ. І каб яно здарылася ў маленькага дзіцяці, не трэба кашляць пяць хвілін — дастаткова 10 секунд. Такая сітуацыя са спыненнем дыхання здарылася з паўтарамесячным дзіцяці ў прыёмным пакоі нашай бальніцы. Добра, што на месцы рэанімацыя, бо выклікаць хуткую ў такой сітуацыі не паспееш. Яго маці пачала кашляць за два тыдні да родаў. Паколькі дарослыя страцілі імунітэт, які атрымалі ў дзяцінстве, яны разам з дзецьмі старэйшага ўзросту з'яўляюцца асноўнымі «пастаўшчыкамі» коклюшу. У свеце востра стаіць гэта праблема і больш чым у 40 краінах уведзена вакцынацыя цяжарных жанчын супраць коклюшу, пачынаючы з 28 тыдня, каб у маці паспелі выпрацавацца ахоўныя імуналаглабуліны і перадацца дзіцяці. Тады яно абаронена да таго часу, пакуль не будзе праведзена яго ўласная вакцынацыя, — расказала Наталля Галькевіч.

### ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Як падкрэсліла Наталля Галькевіч, вакцыны ствараюцца супраць тых хвароб, якія развіваюцца вельмі цяжка, могуць даць ускладненні і прывесці да смерці. Менавіта для таго, каб папярэдзіць такія наступствы, і існуюць прышчэпкі.

— Няма неабавязковых прышчэпак. У нацыянальны календар унесены прышчэпкі супраць тых хвароб, якія існуюць на нашай тэрыторыі. Нам не трэба вакцынавацца ад японскага энцэфаліту і жоўтай ліхаманкі, калі мы не едзем у тыя краіны, дзе гэтыя хваробы цыркулююць, — адзначыла дацэнт.

Пры гэтым не трэба меркаваць, што калі нейкія інфекцыі сустракаюцца рэдка, то яны вам не пагражаюць.

— Мы бачым у інфекцыйнай бальніцы дзяцей любога ўзросту з інфекцыямі. З ветранай воспай немаўля паступала адразу пасля нараджэння, бо маці падчас родаў хварэла, а заразіла яе старэйшае дзіця, якое пайшло ў дзіцячы садок. Зразумела, што захворванне ў нованароджаных развіваецца цяжка. А можна было своечасова прышчапіць маці, якая раней не хварэла, гэтак жа як і старэйшае дзіця, — прывяла прыклад Наталля Галькевіч.

Таксама ўрач нагадала, што асаблівую небяспеку інфекцыі тояць для людзей, якія маюць нізкі імунітэт, напрыклад, пасля прамянёвай і хіміятэрапіі. Для іх тая ж вятранка будзе надзвычай небяспечнай.

— Калі дзіця не атрымала прышчэпку ад паратыту, у будучыні магчыма бясплоддзе. Калі жанчына не атрымала прышчэпку ад краснухі, то падчас цяжарнасці гэта можа адбіцца не толькі на здароўі маці, але і на здароўі будучага дзіцяці. Вакцыны прыдуманы не проста так, а для таго, каб выратаваць наша жыццё, — рэзюмавала Наталля Галькевіч.

## Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(www.belincasgroup.by)

Форма 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2024 г.

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2024 | 31.12.2023 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 57 580 | 133 128 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 593 | 12 734 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 65 434 | 49 131 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | - | 2 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 100 837 | 90 920 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 394 | 396 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 28 558 | 30 741 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 254 396 | 317 052 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 56 744 | 133 745 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 58 | 442 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 20 772 | 10 753 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 77 574 | 144 940 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 131 892 | 131 892 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 16 645 | 14 748 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 6 188 | 6 188 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 22 097 | 19 284 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 176 822 | 172 112 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 254 396 | 317 052 |

Форма 2

### ОТЧЕТ
### о прибылях и убытках
за период, начинающийся 1 января и заканчивающийся 31 марта 2024 г.

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.01.2024 – 31.03.2024 | 01.01.2023 – 31.03.2023 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 175 | 750 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 170 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 1 005 | 750 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 23 097 | 14 973 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 417 | 157 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 22 680 | 14 816 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 68 | 133 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 1 080 | (2) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 33 795 | 16 260 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 48 560 | 29 307 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 35 | 3 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 7 873 | 2 651 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 3 164 | 1 219 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 4 709 | 1 432 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | | |

Председатель Правления А.Е. Назаренко

Главный бухгалтер Н.А. Ероховец

Дата подписания: 2 апреля 2024 г.

УНП 807000270

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродненская табачная фабрика «Неман»**

**Аукцион состоится 21.05.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**
**Телефон для справок 55-87-71**

**Лот № 1**

| | |
|---|---|
